

У АДНУ РАКУ — ТРОЙЧЫ



ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ... У СМАРТФОНЕ







Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 196 (28812)


## ЛІЧБА ДНЯ

**На 56 %**

*у параўнанні з мінулым годам, па прагнозах Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі, вырастуць сёлета аб'ёмы продажаў новых аўтамабіляў у краіне. У афіцыйных дылераў легкавой і камерцыйнай тэхнікі ў ліпені — верасні было набыта больш як 14,2 тыс. аўтамабіляў. Гэта на 58 % больш, чым за аналагічны перыяд 2017 года, і ў два разы больш за паказчык трэцяга квартала 2016 года. Найбольш у ліпені — верасні прададзена новых аўтамабіляў Renault (3 065), LADA (2 975), Volkswagen (1 851). Аўтамабілі беларускай зборкі Geely падняліся ў гэтым рэйтынгу на 4-е месца. Асноўным драйверам росту рынку сёлета была даступнасць умоў крэдытавання і лізінгу.*

# Фёдары-гарманісты



У Рэчыцкім раёне некалі было шмат гарманістаў, лічы, у кожнай вёсцы жылі па два-тры музыканты. А цяпер на ўвесь раён — толькі пару здольных і ўлюбёных у сваё захапленне чалавек. І гэтыя музыканты — два Фёдары. Старэйшаму з іх — Фёдару БЯЛКО — шэсцьдзесят шэсць. Ён нарадзіўся на Тураўшчыне, у яго тры браты таксама змалку асвоілі гармонік і былі найлепшымі музыкантамі. Фёдар працуе на ніве культуры ў вёсцы Азершчына. Акрамя гармоніка, ён выдатна іграе і на баяне. А другі — Фёдар ВАСІЛЕЦ, 54-гадовы жыхар вёскі Заспа, — навучыўся граць ад бацькі, цяпер працуе дырэктарам сельскага Дома творчасці, акампануе вясковым артыстам як на гармоніку, так і на баяне. Фёдары часта сустракаюцца на раённых і міжрэгіянальных фестывалях і конкурсах, весяляць людзей прыгожай народнай музыкай, нават стварылі гурт «Гарэзлівыя гармонік».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Вёска Заспа Рэчыцкага раёна.*

## КОРАТКА

- **Італьянская кампанія MicroPlus стала афіцыйным хронаметрыстам II Еўрапейскіх гульняў.**
- Беларуска Любоў Пашкоўская ўвайшла ў спіс «Топ-50 жанчын — тэхналагічных прадпрымальнікаў з Еўропы», складзены часопісам Forbes.



- **Фізічны пуск рэактара першага блока БелАЭС запланаваны на сакавік 2019 года.**
- Колькасць шматдзетных сем'яў у Мінску штогод павялічваецца на 1 тыс.
- **Украіна адмаўляецца ад удзелу назіральнікаў СНД на маючых адбыцца ў 2019 годзе прэзідэнцкіх выбарах.**
- Эксперты «Грынпіс» назвалі галоўных вытворцаў пластыкавага смецця, імі апынуліся Coca-Cola, PepsiCo і Nestle.

ISSN 1990 - 763X

Па сутнасці

# Я ПРЫШЧЭПКІ НЕ БАЮСЯ?

## Чаму ўсіх дзяцей трэба абараняць ад інфекцый



**Прышчэпкі — тэма, якая прымушае бацькоў як мінімум задумацца. Выпадкі з ускладненнямі пасля вакцынацыі ўвогуле выклікаюць разгубленасць: наколькі прышчэпкі бяспечныя для дзіцяці? Пра гэта мы пагутарылі з кандыдатам медыцынскіх навук, дацэнтам кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалаем ГАЛАБАРОДЗЬКАМ.**

### «Эўпента»: за і супраць

***— Мікалай Уладзіміравіч, давайце пачнём з вакцыны «Эўпента», якая нарабіла шмат шуму: і закуплялі яе быццам бы не так, і танная яна ў параўнанні з еўрапейскімі... Што не так з гэтай вакцынай?***

— Кажучы пра анафілактычны шок у хлопчыка з Ганцавіцкага раёна, ад якога той загінуў, трэба памятаць, што ён развіўся ад увядзення дзвюх вакцын: гэта французская «Імавакс Поліа» і паўднёвакарэйская «Эўпента». На кампанент якой з іх зрэагаваў арганізм, мы дакладна не ведаем. Анафілактычны шок — гэта індывідуальная алергічная рэакцыя, і тое, што ён здарыўся, хутчэй залежыць не ад антыгену, які ўводзіцца, а ад таго, што ў чалавека існуе прыроджаная рэактыўнасць да гэтага антыгену. Ён можа ўзнікнуць незалежна ад таго, еўрапейская гэта вакцына ці паўднёвакарэйская, з большай ці з меншай ступенню ачысткі. Усё гэта не ўплывае на рызыку развіцця анафілактычнага шоку. Але здараецца ён рэдка — 1-2 выпадкі на мільён прышчэпленых. Прычым ён можа развіцца ад кантакту з рознымі антыгенамі — не толькі з прышчэпкавымі, але, напрыклад, і з лекавымі. У СМІ шырока асвятляўся выпадак з анафілактычным шокам на цэфтрыаксон некалькі гадоў таму. Такая рэакцыя ўзнікае і на ўкусы вос — некалькі тыдняў таму загінула жанчына.

СТАР. 4

У пошуках каранёў

# Таямніцы Друцкага кургана

## Назіраем за логікай археалагічнага даследавання



**Археолагі — самыя сапраўдныя следчыя па вывучэнні нашага мінулага. Іх высновы грунтуюцца не на думках і меркаваннях, а на канкрэтных знаходках, якія шмат пра што сведчаць. Калі супаставіць усё з інфармацыяй, змешчанай у летапісах і дакументах, вымалёўваецца зусім ясная карціна! Разам з загадчыцай цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктарам гістарычных навук, прафесарам Вольгай ЛЯЎКО мы зладзілі такую ўяўна-дакладную вандроўку ў наша мінулае. Спадарыня Вольга расказала, якім чынам удалося адшукаць астанкі прапраўнука князя Усяслава Чарадзея.**

СТАР. 15

# ЁСЦЬ УПЭЎНЕНАСЦЬ У ЗАЎТРАШНІМ ДНІ

## Аляксандр Лукашэнка прагназуе яркі росквіт адносін Беларусі і Расіі

**Такое меркаванне выказаў кіраўнік дзяржавы падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расіі ў Беларусі, спецыяльным прадстаўніком Прэзідэнта Расіі па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю Міхаілам Бабічам.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што звычайна на першай афіцыйнай сустрэчы кажуць нешта важнае ці пратакольнае. «Але, напэўна, было б смешна, калі б я абмежаваўся нейкай пратакольнай заявай або выказваннем, хоць гэта таксама важна», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў Міхаілу Бабічу пра вялікую колькасць публікацый у інтэрнэце, прысвечаных яго прызначэнню. Пасол, у сваю чаргу, адзначыў, што чытаў усе.

«Сказаць, што там няма праўды нейкай долі, будзе няшчыра. Калі сказаць, што там ёсць праўда, таксама будзе няшчыра. Кожная група людзей, якія цікавяцца беларуска-расійскімі адносінамі, спрабавала праецыраваць праз асобу пасла — тым больш, вы ведаеце, што вельмі доўга працаваў ранейшы пасол, — нагадаў Прэзідэнт. — Тэма не была актуальнай, а тут — прызначэнне новага пасла. І ў сілу нашых адносін з Расійскай Федэрацыяй праз асобу вашу спрабавалі нешта выказаць. Скажу шчыра, што больш было негатыву. Я хацеў бы, каб ваш перыяд работы ў дыпламатычным ведамстве, пасольстве нашай братэрскай Расіі ў Беларусі, быў самы актыўны, эфектыўны і прарыўны. Калі вы на гэта настроены — а ў мяне менавіта такое ўражанне, што вы настроены на такую працу, — лічыце, што ў нас так і атрымаецца».

На думку кіраўніка дзяржавы, гэта будзе перыяд самага яркага росквіту двухбаковых адносін Беларусі і Расіі. Упэўненасць у гэтым пацвярджаецца размовай беларускага лідара з Уладзімірам Пуціным, на якой неадназова абмяркоўвалася кандыдатура Міхаіла Бабіча на адказную пасаду. Расійскі Прэзідэнт, надзяліўшы пасла Расіі дадатковымі маштабнымі паўнамоцтвамі (у тым ліку ў сферы эканомікі, чаго раней не бывала), звярнуў увагу, што Беларусь — гэта найважнейшая краіна, з якой Расія выбудуе адносіны.

Беларускі лідар нагадаў, як, рэагуючы на некаторыя словы і дзеянні расійскіх улад, адкрыта казаў: зразумела, што Расія не хоча страціць Беларусь. «І я б сапраўды так, калі б быў у кіраўніцтве Расіі, паводзіў сябе і перажываў за Беларусь, з кім яна будзе: ці яна паверне на Захад, як некаторыя пісакі, асабліва ў Расіі, гэта абмяркоўваюць і нашы, як я кажу, плявузгаюць тут пастаянна, ці яна будзе разам з брацкай Расіяй, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вы ведаеце, адкрыта скажу, мне паварочваць туды-сюды, напэўна, не да месца. Мне, Прэзідэнту, які ўжо адзін раз павярнуў ад заўзятага нацыяналізму і іншых антырасійскіх пытанняў, правёўшы рэферэндум у Беларусі, калі народ вызначаўся: мы з кім? І за саюз Беларусі і Расіі прагаласавала не проста большасць — пераважная большасць нашага насельніцтва».

На яго думку, і сёння беларускі народ бачыць у Расіі блізкага саюзніка, які заўсёды прыйдзе на дапамогу пры неабходнасці. Тым жа будзе адказваць і Беларусь.

«Непарушна адно, і вы гэта добра ведаеце: мы суверэнная і незалежная краіна. Калі ўжо шчыра казаць, не толькі дзякуючы памкненням нашага народа мы сталі суверэннай і незалежнай дзяржавай. Гэтага хацела Расія і тагачаснае кіраўніцтва Расіі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама дадаў, што, паколькі цяперашняе кіраўніцтва заяўляла аб пераемнасці курсу, у XXI стагоддзі казаць пра ўключэнне Беларусі ў склад Расійскай Федэрацыі — проста смешна. Нагадаем, публікацыі на гэтую тэму з'яўляліся на розных рэсурсах.

«Я ні разу ад цяперашняга Прэзідэнта Расіі гэтага не чуў і ад мінулага, першага Прэзідэнта Расіі я ніколі пра гэта не чуў. Я думаю, мы выбудуем нармальныя адносіны, але я хачу, каб вы пра гэта пачулі з маіх вуснаў публічна, як я бачу нашы адносіны з Расійскай Федэрацыяй. Крыху бязладна, можа быць, я сказаў, я гатовы на гэтую тэму размаўляць, я думаю, мы агульную мову знойдзем, але я б вельмі-вельмі хацеў, яшчэ раз паўтару, каб мы зрабілі гэты перыяд, якім ганарыліся б і мае, і вашы дзеці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У адказ Міхаіл Бабіч падзякаваў Прэзідэнту за цёплы прыём. Пасол адзначыў, што за першы месяц працы ў нашай краіне ў яго склалася ўражанне, што ён знаходзіцца тут досыць даўно, паколькі з першых дзён адчуў увагу і жаданне ўсіх калег зрабіць так, каб перыяд азнаямлення са становішчам быў як мага больш кароткі і эфектыўны.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Узрасла глабальная залежнасць ад долара



Глабальная фінансавая сістэма стала яшчэ больш залежаць ад долара з часоў апошняга крэдытнага крызісу, у сувязі з чым цяперашні рост прыбытковасці казначэйскіх папер ЗША і амерыканскай валюты нясе сур'ёзныя рызыкі, піша Bloomberg. Як сцвярджаюць аналітыкі Nedbank Group, умацаванне долара і рост кошту капіталу ў свеце з'яўляюцца «ідэальнай сумессю для крызісу ліквіднасці». Адзначаецца, у прыватнасці, што ключавой асаблівасцю сусветнага фінансавага крызісу 2008 года быў хранічны недахоп долараў. Падзеі дзесяцігадовай даўніны заахвоцілі Федэральную рэзервовую сістэму ЗША ўліваць ліквіднасць у сусветную фінансавую сістэму праз свопы з больш чым дзясяткам цэнтральных банкаў. З тых часоў аб'ём запазычанняў у доларах (не ўключаючы банкі) вырас з 9,5 да 14 працэнтаў сусветнага валавога ўнутранага прадукту. Прыбытковасць дзесяцігадовых аблігацый дасягнула максімальнага паказчыка з 2011 года. Выдanne падкрэслівае, што сусветны крызіс ліквіднасці становіцца ўсё больш верагодным, паколькі міжнародныя інвестары імкліва скідваюць нідоларавыя активы. Раней эксперты Moody's Analytics папярэдзілі, што прычынай наступнага фінансавага крызісу ў ЗША, а затым і ва ўсім свеце, могуць стаць хуткарослыя рызыкоўныя даўгі амерыканскіх нефінансавых кампаній у сукупнасці са «смеццевымі» карпаратыўнымі аблігацыямі.

## Бангладэш уводзіць смяротнае пакаранне за злачынствы, звязаныя з наркотыкамі

У краіне прынялі праект закона аб смяротным пакаранні за злачынствы, звязаныя з наркотыкамі, перадае



Channel News Asia. Прэм'ер-міністр краіны Шэйх Хасін Вазед запусціла кампанію па знішчэнні наркотыкаў у краіне, у выніку якой паліцыя з мая забіла ўжо каля 200 чалавек, піша выданне. Праваабарончыя арганізацыі раскрытыкавалі падыход улад да вырашэння праблемы. Яны асцерагаюцца, што ў краіне з'явіцца тая самая сітуацыя, як на Філіпінах, дзе падчас вайны з наркотыкамі без суда былі забітыя тысячы чалавек. У новым законе метамфетамін, які ў Бангладэш называюць яба, упершыню прызнаны наркатычным рэчывам. Згодна з дакументам, за кантрабанду, распаўсюджванне або ўжыванне больш чым пяці грамаў можа пагражаць максімальная мера пакарання. Калі наркотыку пры затрыманым будзе менш, злачынца адправяць у турму. Па словах прадстаўніка ўрада, закон неабходны, каб перакрыць паток наркотыкаў з суседняй М'янмы. Па словах Хасін, вайна з наркотыкамі ў краіне не спыніцца, пакуль не будзе выйграная.

## МВФ панізіў прагноз па цэнах на нафту



Міжнародны валютны фонд панізіў прагноз сусветных цэн на нафту на 2018 і 2019 гады. Як вынікае з кастрычніцкага даклада фонду па сусветнай эканоміцы World Economic Outlook сярэдні кошт «чорнага золата» ў 2018 годзе складзе 69,38 долара за барэль і 68,76 долара — налета. Адпаведна зніжэнне цэн на сыравіну, згодна з прагнозам МВФ, прагназуецца на 0,23 і 0,85 долара. «Меркаваная сярэдняя цана за барэль нафты была 52,81 долара ў 2017 годзе», — адзначаецца ў дакладзе фонду. Нагадаем, раней МВФ прагназаваў, што цэны на сыравіну ў 2018—2019 гадах усталююцца вышэй за адзнаку ў 70 долараў за барэль.


**ООО «Юридическая компания Аспект» проводит повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «МОДЕРАТО», находящегося в процедуре ликвидации**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот, руб. | Шаг торгов, руб. | Задаток для участия в торгах, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой автомобиль МАЗ 5337 1989 г. в., шасси | 3 340,00 | 167,00 | 334,00 |
| 2 | Компрессор ПВ-10 на шасси МАЗ 8925 1989 г. в. | 3 800,00 | 190,00 | 380,00 |

*Торги состоятся* ***24.10.2018 г. в 10.00*** *по адресу г. Минск, ул. Панфилова, д. 2, пом. 49, оф. 6 (1-й этаж). Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до* ***22.10.2018 г****. включительно. Заявки принимаются организатором по месту проведения торгов*

| | |
|---|---|
| Продавец | **ООО «МОДЕРАТО»** |
| Организатор торгов | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| Реквизиты для оплаты задатка | **Бенефициар – ООО «МОДЕРАТО», г. Минск, ул. Восточная, 129, оф. 308, счет в BYN № BY05BLBB30120100159037001001, в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 100159037** |

Условия торгов

К участию в торгах (аукционе) допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;
лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка, а также документы, предусмотренные п. 12 постановления Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица», физическим лицом задаток может быть уплачен в кассу Продавца;
победителем торгов признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;
договор купли-продажи подлежит заключению в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;
победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;
в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, подписания договора внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;
в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;
победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает цену лота **без учета НДС 20 %** (продавец не является плательщиком НДС), за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 5 (пяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи, если иной срок для оплаты не определен соглашением сторон

Предыдущее извещение о торгах опубликовано в печатном издании газеты «Звязда» за 20.07.2018 г.
Получить дополнительную информацию о порядке проведения аукциона можно по телефонам: + 375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «Знамя индустриализации»**

**24 октября 2018 года** состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Знамя индустриализации» по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, зал заседаний.

**Повестка дня собрания:**

1. Об утверждении договора о присоединении открытого акционерного общества «Промкомбинат» к открытому акционерному обществу «Знамя индустриализации».
2. Об утверждении передаточного акта.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д.11, в рабочие дни с 15 октября 2018 года по 23 октября 2018 года по месту нахождения общества (ком. 27) с 9.00 до 16.00, 24 октября 2018 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.30 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 24 октября 2018 года в 15.00.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров – 15 октября 2018 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Знамя индустриализации».

УНП 300200360

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СП «ВЕСТАВТО», ОАО**

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-10202 (наименование – гостиница; назначение – здание гостиниц, мотелей, кемпингов), пл. 8117,3 кв. м, расположенное на земельном участке пл. 1,1818 га с кадастровым номером 140100000001002563 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 19 | **1 216 800,00** | **24 336,00** |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Условия оплаты** | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Шаг аукционных торгов** | 5 % |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, г. Брест, ул. Мицкевича,10, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 31 октября 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам 8 (0162) 20-92-13; 21-88-81**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 30 октября 2018 г. до 17.00**

Сацыяльны клопат

# МАМА — ПЕРШАЕ СЛОВА...

## Праца, якая высока ацэньваецца на дзяржаўным узроўні

**Дзень маці — свята міжнароднае, але адзначаецца яно ў розных краінах не ў адзін і той жа дзень. У Беларусі яно адзначаецца 14 кастрычніка і мае карані ў рэлігійным свяце — Пакрове Прасвятой Багародзіцы, і ў гэты дзень ва ўсіх праваслаўных цэрквах праходзяць святочныя набажэнствы. А ўсе тыя, у каго ёсць мама, віншуюць яе — тэлефанаваннем, паштоўкай, іншымі падарункамі, як кожны сам вырашыць. І, напэўна, асабліва шмат віншаванняў атрымліваюць у гэты дзень шматдзетныя маці...**

### Ордэн Маці сёлета атрымала 621 беларуска

Гэтая высокая дзяржаўная ўзнагарода прадугледжана для маці, якія выхавалі пяцёра і больш дзяцей. «У нашай краіне ўжо ўзнагароджаны больш за 9,5 тысячы маці, з іх 621 жанчына — у 2018 годзе, — паведаміў журналістам **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.** — Такім чынам, праца мацярынства высока ацэньваецца на дзяржаўным узроўні».

Да ордэна прадугледжана грашовая выплата ў памеры пяці бюджэтаў пражытковага мінімуму (з 1 жніўня да 31 кастрычніка 2018 года 1 БПМ — гэта 213,67 рубля).

### У Беларусі будзе створана база даных шматдзетных сем'яў

Як заявіў Валерый Кавалькоў, Рэспубліканская міжведамасная база даных шматдзетных сем'яў будзе створана да 2020 года. Зараз распрацоўваецца праект указа аб яе фарміраванні. Гэты рэсурс дазволіць выяўляць шматдзетныя сем'і і маніторыць, наколькі поўна ім аказваецца дзяржаўная падтрымка.

«Далёка не заўсёды грамадзяне краіны ведаюць аб тых сацыяльных гарантыях, якія даюцца ў Беларусі шматдзетным сем'ям, — адзначыў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны. — Цяпер улік шматдзетных сем'яў вядзецца на рэгіянальным узроўні — на базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у якія паступае інфармацыя з устаноў адукацыі, аховы здароўя, сістэмы МУС. Банкі даных розных катэгорый сем'яў з дзецьмі, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы і дапамозе, уключаюць інфармацыю, што датычыцца ўмоў пражывання, занятасці бацькоў, фактараў сацыяльнай неўладкаванасці. Дарэчы, на ўліку ў ТЦСАН на 1 ліпеня 2018 года знаходзілася звыш 100 тысяч шматдзетных сем'яў, 29 тысяч сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, і амаль шэсць тысяч няпоўных сем'яў.



### Самая запатрабаваная — паслуга нянькі

Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва арганізуюць работу з сем'ямі, якія выхоўваюць дзяцей у залежнасці ад іх патрэб: аказваюць кансультацыі, сацыяльна-псіхалагічныя і пасрэдніцкія паслугі, паслугі пагадзіннага догляду за дзецьмі, часовага прытулку, сацыяльнага патранату. Пры гэтым найбольш запатрабаванай Валерый Кавалькоў назваў паслугу нянькі. Яна прадастаўляецца сем'ям, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей, што нарадзіліся адначасова (двойні, тройні) ва ўзросце да трох гадоў, дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў. Толькі за першае паўгоддзе 2018 года паслугамі няні скарысталіся амаль 2 тысячы сем'яў, у тым ліку больш за 1,7 тысячы сем'яў, якія выхоўваюць двойню, 46 сем'яў з тройняй і 200 сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

З гэтага года прэтэндаваць на паслугу нянькі таксама могуць сем'і, у якіх абодва бацькі альбо адзін з іх у няпоўнай сям'і з'яўляюцца інвалідамі I або II групы. А сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю, на базе дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў аказваецца паслуга сацыяльнай перадышкі. Яна дае магчымасць для бацькоў такіх дзяцей крыху адпачыць ад абавязкаў па доглядзе, аднавіць сілы, вырашыць сямейна-бытавыя і іншыя пытанні. Прычым на перыяд аказання паслугі за сям'ёй захоўваецца права на ўсе сацыяльныя выплаты (пенсія, дапамогі).

**Святлана БУСЬКО.**

**Дарэчы, слова, якое пазначае маму, практычна ва ўсіх мовах складаецца з двух аднолькавых складоў. Беларускія і рускія дзеці кажуць «мама», маленькія французы — «маман», нямецкія хлопцы — «мама», англійскія — «мэмма», кітайскія — «мама», карэйскія — «амана». Навукоўцы лічаць, што гэта звязана з маўленчым апаратам немаўляці. Ён устроены такім чынам, што дзіцяці лягчэй за ўсё вымавіць адкрыты галосны гук «а» і губныя зычныя «м», «б», «п», якія ёсць ва ўсіх мовах. А яшчэ дзіцёнку складана адразу паўтараць паслядоўнасць розных складоў, таму спачатку вымаўляецца «ма-ма», «па-па», «ба-ба»...**

Сямейнае права

# ЮРЫДЫЧНЫ ПАДАРУНАК

**для шматдзетных маці падрыхтавалі Міністэрства юстыцыі Беларусі і Беларуская натарыяльная палата. 11 кастрычніка жанчыны змогуць атрымаць бясплатную юрыдычную кансультацыю ў Мінюсце, а 12 кастрычніка — ва ўсіх натарыяльных канторах і бюро краіны.**

З нагоды Дня маці, які адзначаюць у Беларусі 14 кастрычніка, 11 кастрычніка з 11 да 13 гадзін на вуліцы Калектарнай, 10, на трэцім паверсе ў зале пасяджэнняў (кабінет 321) Мініста шматдзетных матуль і іх прадстаўнікоў чакаюць юрысты, адвакаты і натарыусы.

А 12 кастрычніка ўсіх мам Беларусі, якія выхоўваюць трох і больш непаўналетніх дзетак, на працягу дня чакаюць натарыусы па ўсёй краіне. У гэтыя дні маці змогуць атрымаць адказы на розныя пытанні, якія датычацца прымусовага выканання судовых пастаноў, спагнання аліментаў, дзейнасці натарыусаў і супрацоўнікаў загсаў, а таксама высветліць іншыя прававыя моманты. Поўны спіс натарыяльных кантор і бюро і час іх працы можна ўдакладніць на сайце Беларускай натарыяльнай палаты belnotary.by ў раздзеле «Знайсці натарыуса».

**Ірына СІДАРОК.**

Іграр Крутой

# Ігар Крутой зробіць шоу для II Еўрапейскіх гульняў

**Цырымоніямі адкрыцця і закрыцця Еўрапейскіх гульняў 2019 года зоймецца творчая група пад кіраўніцтвам вядомага кампазітара і прадзюсара, народнага артыста Расіі Ігара Крутога. Акрамя таго, над відовішчнай забаўляльна-музычнай праграмай працуюць адразу два рэжысёры: Аляксандр Вавілаў ад Беларусі і Аляксей Сечанаў ад Расіі.**

«Наша задача — паказаць свету Беларусь ва ўсёй яе прыгажосці. Мы раскажам цікавую гісторыю, у якой адлюструем самабытную культуру і традыцыі беларускага народа», — расказаў Ігар Крутой на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

На рахунку кампаніі «Арт Сіці 5», якую ўзначальвае Крутой, ужо ёць шэраг паспяхова рэалізаваных на міжнародным узроўні культурна-масавых мерапрыемстваў, у тым ліку цырымоніі адкрыцця і закрыцця 7-х зімовых Азіяцкіх гульняў (Астана, 2011 год), шоу для 27-й Сусветнай летняй Універсіяды (Казань, 2013), 16-ы чэмпіянат FINA па водных відах спорту (Казань, 2015), папулярныя музычныя конкурсы «Новая хваля» і «Дзіцячая Новая хваля» (Сочы), тэлепраект "Песня года», сольныя канцэрты вядучых артыстаў расійскай эстрады.

Да Еўрапейскіх гульняў 2019 года яшчэ застаецца дастаткова часу, каб цалкам адказна і грунтоўна падрыхтаваць цырымоніі адкрыцця і закрыцця. На цяперашнім этапе, расказалі ўдзельнікі творчай каманды, распрацоўваецца літаратурны сцэнарый, пасля ўзгаднення і, пры неабходнасці, карэкціроўкі якога пачнецца ўжо дэталёвая «раскадроўка» двухгадзіннага шоу. Таму ніякіх падрабязнасцяў арганізатары пакуль не раскрываюць, хоць і абяцаюць мноства прыемных сюрпрызаў для публікі, а таксама плануюць запрасіць медыяперсону сусветнай велічыні.

Шоу будзе цалкам жывой падзеяй, падкрэсліў міністр культуры Юрый Бондар, і пройдзе на самым высокім узроўні, «каб кожны глядач сышоў са стадыёна або ад тэлеэкрана задаволены».

Нагадаем, II Еўрапейскія гульні, якія адбудуцца ў Мінску з 21 да 30 чэрвеня 2019 года, збяруць сама менei 18 тысяч афіцыйных удзельнікаў, у тым ліку больш як 4 тысячы спартсменаў, якія выступяць у 15 відах спорту. Трансляваць падзеі міжнароднага спартыўнага форуму плануецца ў 160 краінах свету.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Чулі?!

# САЎРАСАЎ У ПАКЕЦЕ

**Жывапісныя карціны вядомых мастакоў выявілі гомельскія мытнікі падчас правядзення агляду цягніка «Кіеў — Санкт-Пецярбург». Палотны ў папяровай і поліэтыленавай упакоўцы знаходзіліся за халадзільнікам у службовым купэ праваднікоў.**



**Выяўленая карціна Віктара Зарубіна.**

Як паведамілі ў Гомельскай мытні, паводле заключэння эксперта высветліў, што панарамны пейзаж з відам на бераг ракі стварыў выдатны рускі пейзажыст XIX стагоддзя Аляксей Саўрасаў.

Рынкавы кошт карціны — каля 40 тысяч долараў. Аўтар другой карціны, напісанай у 1924 годзе, — рускі мастак Віктар Зарубін.

Абодва творы мастацтва адносяцца да катэгорыі культурных каштоўнасцяў. Па гэтым факце Гомельская мытня праводзіцца праверка.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Меркаванне

# Нарматыў на электрычнасць хутка адменяць?

**Усіх нас цікавіць адно пытанне: ці знізяцца тарыфы на электраэнергію для насельніцтва пасля ўводу БелАЭС? Пакуль што дакладнага адказу Мінэнерга не дае, але ў той жа час яно выступае за карэкціроўку самой схемы спажывання электраэнергіі насельніцтвам.**

І размовы ў кулуарах міністэрства сведчаць пра тое, што хутка ўсталюецца адзіная цана на электрычнасць, а дыферэнцыяцыі тарыфаў не будзе. Ужо нават вядома, калі гэта адбудзецца. «З улікам таго, што насельніцтва наблізілася ўшчыльную да пакрыцця выдаткаў, якія нясе энергасістэма па вытворчасці электраэнергіі, разглядаецца пытанне ад сыходу ад дыферэнцыяцыі тарыфаў у залежнасці ад аб'ёмаў спажывання па ўсіх хатніх гаспадарках, пачынаючы з 2019 года», — заявіла падчас энергетычнага форуму **намеснік міністра энергетыкі краіны Вольга ПРУДНІКАВА.**

Гэта асноўны фактар. Але ёсць і іншыя. Напрыклад, больш за 80 % хатніх гаспадарак укладваюцца ў дыферэнцыраваны тарыф, субсідаваны дзяржавай. Акрамя гэтага, у нашай краіне прыняты дадатковы план дзеянняў, які датычыцца павелічэння электраспажывання ў рэальным сектары. Так, увод двух энергаблокаў БелАЭС значна павялічыць магутнасць айчыннай энергасістэмы.

**У ТЭМУ**

**Нагадаем, што цяпер па субсідаваных дзяржавай расцэнках можна браць толькі 150 кВт, калі ёсць газавая пліта, або 250 кВт, калі яна электрычная. Калі ліміт будзе перавышаны, прыйдзецца плаціць на 16—28 % больш.**

Калі ініцыятыва Мінэнерга рэалізуецца, то сітуацыя зменіцца — цана стане адзінай. «Гаворка не ідзе аб павышэнні нарматыву спажывання ў 150 кілават-гадзін электраэнергіі. Мы выступаем за тое, каб зняць яго наогул, а не павысіць да 200 або 300 кВт, ніякіх гранічных лічбаў не павінна быць», — растлумачыла намеснік міністра.

Яшчэ адным новаўвядзеннем стане дыстанцыйнае зняцце паказанняў з кватэрных электралічыльнікаў, якія маюць намер усталёўваць спачатку ў новабудоўлях. Першыя падобныя праекты ўжо запушчаны.

Падобная работа праводзіцца і ў галіне газа і цеплазабеспячэння. «Спадзяюся, што праз пэўны перыяд часу кожная сям'я будзе мець лічыльнік цеплавой энергіі і рэгуляваць магчымасць выкарыстання энергарэсурсаў для ўласных патрэб», — сказала Вольга Пруднікава.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Я ПРЫШЧЭПКІ НЕ БАЮСЯ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што датычыцца пытання закупак, то ў большасці краін свету існуе практыка пазбягаць дублюючых працэдур ліцэнзавання. Калі лекавы сродак ці вакцына атрымалі ліцэнзію ў адной з краін з моцным рэгулятарным органам (гэта краіны ІСН — ЗША, Канада, Японія, некаторыя еўрапейскія краіны) ці ёсць сертыфікат міжнароднай арганізацыі, напрыклад прэкваліфікацыя Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, як гэта было ў выпадку з «Эўпентай», то ў большасці краін не патрабуецца дублюючай нацыянальнай рэгістрацыі.

У свеце вакцыны каштуюць вельмі па-рознаму. І гэта залежыць не толькі ад таго, якая вакцына, але і хто яе закупляе. Тыя ж еўрапейскія вытворцы прадаюць свае вакцыны па адной цане заможным краінам, па другой — краінам з даходам сярэднім і ніжэйшым, і па трэцяй — міжнародным арганізацыям, якія пастаўляюць вакцыны ў бедныя краіны.

Замена расійскай вакцыны АКДС на «Эўпенту» мела на мэце два станоўчыя моманты. На сайце Беларускай таварнай біржы можна ўбачыць, што за апошні час многія партыі АКДС былі забракаваныя нашай лабараторыяй кантролю якасці імунабіялагічных прэпаратаў. Расійскі вытворца не мог забяспечыць пастаянную прысутнасць вакцыны. Кампанія LG Chem, якая вырабляе «Эўпенту», — вядомы ў свеце вытворца імунабіялагічных прэпаратаў. Трэба разумець, што вакцыны вырабляць нашмат складаней, чым лекі. Такую вытворчасць не створыш за пару месяцаў з чыстага ліста. Усе кампаніі ў свеце вядомыя. З LG Chem наша краіна мае даўняе супрацоўніцтва, яны пастаўляюць нам вакцыну «Эўвакс В» ад гепатыту В.

Другі момант: у адрозненне ад расійскай трохвалентнай АКДС у «Эўпенце» ёсць яшчэ два кампаненты: Хіб-інфекцыя (або гемафільная інфекцыя) і гепатыт В. Дагэтуль у нас ад Хіб-інфекцыі прышчапляліся ўсе дзеці толькі ў Мінску, а рэгіёны яе не мелі. «Эўпента» дазволіла вакцынаваць ад яе ўсіх дзяцей у краіне. Хіб-інфекцыя — вельмі цяжкая хвароба. З той пары, як у Мінску з'явіліся ад яе прышчэпкі, я амаль перастаў бачыць у нашай клініцы дзяцей з гемафільнымі менінгітамі, з такімі цяжкімі ўскладненнямі, як эпіглатыт — гэта запаленне надгартанніка, якое можа выклікаць спыненне дыхання і смерць. Гемафільная палачка — адзін з узбуджальнікаў (разам з пнеўмакокам) асноўных бактэрыяльных інфекцый у дзяцей: пнеўманій, вострых сярэдніх атытаў, сінусітаў. Увядзенне ў руцінную практыку вакцыны супраць гемафільнай інфекцыі — гэта крок наперад для нашага прышчэпачнага календара.

Сёння ўвесь свет рухаецца да таго, каб вакцыны сталі камбінаванымі. Мы стараемся знізіць колькасць візітаў дзіцяці да ўрача і колькасць уколаў.

***— Наколькі гэта бяспечна для імунітэту? Тая ж трохвалентная АКДС (супраць краснухі, дыфтэрыі і слупняку) і так няпроста пераносіцца — часта выклікае, напрыклад, тэмпературу. А калі кампанентаў пяць, як у «Эўпенты»?***

— Трэба дакладна падзяляць рэакцыю і ўскладненне. Рэакцыя — гэта павышэнне тэмпературы, пачырваненне ў месцы ўколу, і гэта даволі бяспечныя рэчы. Напрыклад, пасля вакцыны АКДС здараецца перыяд неспакою дзіцяці — гэта рэакцыя, і яна бяспечная. Павышэнне тэмпературы — знак таго, што імунітэт уключыўся ў развіццё імуннай рэакцыі, ён выпрацоўвае абарону. А вось ускладненні, заканчваючы самым цяжкім — анафілактычным шокам, — небяспечныя рэчы. І яны сустракаюцца вельмі рэдка. Рэакцыі ж бываюць часта. У АКДС і «Эўпенце» найбольш рэактыўным з'яўляецца коклюшны кампанент. У вакцынах ён бывае ў двух варыянтах: цэльнаклетачны коклюш і бясклетачны. У складзе тых жа французскіх «Тэтраксім», «Гексаксім», бельгійскай «Інфанрыкс Гекса» бясклетачны коклюш. І гэтыя вакцыны сапраўды менш рэактагенныя, у дзяцей радзей павышаецца тэмпература. А ў расійскай АКДС ці паўднёвакарэйскай «Эўпенце» знаходзіцца цэльнаклетачны коклюшны кампанент, на які крыху часцей бывае рэакцыя. Але і тыя, і другія вакцыны бяспечныя, ускладненні на іх сустракаюцца аднолькава рэдка. Адметна, што большая частка краін у свеце вакцынуецца цэльнаклетачнымі коклюшнымі вакцынамі, бо яны значна таннейшыя.

А што датычыцца камбінаваных вакцын і іх нагрузкі на імунную сістэму, то гэта распаўсюджаны ў постсавецкіх краінах міф. На самай справе колькасць антыгенаў, якая ўваходзіць у сучасную вакцыну, значна меншая, чым у цэльнага мікроба. І адна справа — перанесеная інфекцыя, дзе сапраўды імунная сістэма ўключаецца вельмі моцна. І іншая — прышчэпка з невялікай колькасцю антыгену. Для імуннай сістэмы гэта не з'яўляецца ўдарам. Калі дзіця нараджаецца, у першыя ж суткі яно сустракаецца з такой колькасцю чужародных антыгенаў, з якой не сутыкнецца за ўсе прышчэпкі, атрыманыя ў жыцці. І імунная сістэма ад гэтага не пакутуе. Сучасныя вакцыны становяцца больш ачышчанымі. Вы, напрыклад, у савецкія часы атрымалі ад прышчэпак куды большую колькасць атыгенаў, чым цяперашнія дзеці.

## Калі вакцыну даводзіцца мяняць

***— А здаецца, што ў савецкія часы прышчэпкі пераносіліся лягчэй і рэакцый было меней...***

— Гэта не так. Раней вакцыны былі больш рэактагенныя. Урачы шмат робяць, але мала пра гэта кажуць. Калі б больш расказвалі, было б больш даверу да нашай дзейнасці. Прывяду некалькі прыкладаў, як за апошнія гады мы мянялі вакцыны. Раней ад туберкулёзу, а ён — вялікая праблема для Беларусі і некаторых суседніх краін — мы прышчаплялі вакцынай БЦЖ. Цяпер мы памянялі яе на менш рэактагенную БЦЖ-М.

Наступны прыклад — вакцына ад поліяміеліту. Яшчэ некалькі гадоў таму гэта была жывая вакцына ў кропельках (яна змяшчае жывы аслаблены мікроб). Зараз мы цалкам перайшлі на ўнутрымышачнае ўвядзенне нежывой поліяміелітнай вакцыны, якая, у адрозненне ад папярэдняй, не можа выклікаць вакцынаасацыяваных хвароб. Тое самае з прышчэпкамі супраць адру, краснухі і паратыту. Некалькі гадоў таму выкарыстоўвалі расійскую вакцыну. І эпідэміёлагі заўважылі, што вырасла колькасць вакцынаасацыяваных паратытаў — свінкі ў лёгкай форме (прыпуханне слінных залоз) пасля прышчэпкі. У сувязі з гэтым расійскую вакцыну замянілі на еўрапейскую «Глаксо». Такім чынам, кантроль за пабочнымі рэакцыямі вядзецца, і, калі іх становіцца больш, вакцыну мяняюць.

***— Ад якой колькасці інфекцый абараняюць прышчэпкі нашага нацыянальнага календара?***

— Ад 12. Ва ўсіх развітых краінах апошнім часам ідзе пашырэнне календара. Я не стамлюся паўтараць, што прышчэпка — просты спосаб абараніць дзіця ад сур'ёзных інфекцый. Як доктар, які бачыць, як хварэюць непрышчэпленыя дзеці на інфекцыі, ад якіх іх мелі магчымасць абараніць бацькі, але не зрабілі гэтага, хачу сказаць, што хваробы гэтыя вельмі сур'ёзныя. Здавалася б, дзе той коклюш? Але кожны дзень у бальніцы, дзе я працую, пару чалавек з ім знойдзецца. Калі гэта зусім малое дзіця, прыступы начнога закашлівання выбіваюць з жыцця ўсю сям'ю. У дзіцяці першага года жыцця справа можа дайсці да спынення дыхання. Год таму ў нас у клініцы было такое малое, якое, на шчасце, удалося рэаніміраваць, але лячыцца яму давялося доўга.

***— Ці не рана рабіць прышчэпкі дзецям да года?***

— І ў Беларусі, і ў Еўропе, і ў ЗША прышчэпкі імкнуцца зрабіць максімальна рана. Асноўную большасць пачынаюць пасля двух месяцаў. Чаму, акрамя гепатыту В і туберкулёзу, іх не робяць у першыя дні жыцця? У першыя пару месяцаў у дзіцяці маюцца антыцелы, якія яно атрымала ад маці. І яны цыркулююць у крыві, абараняюць ад інфекцый. І будуць перашкаджаць развіццю ўласнага імуннага адказу, калі зрабіць у гэты час прышчэпкі. Таму большасць прышчэпак робіцца ў 2-3 месяцы, калі колькасць мацярынскіх антыцелаў пачынае зніжацца. Не трэба адкладваць прышчэпкі да года ці да той пары, пакуль, на думку бацькоў, імунітэт стане лепшы. Нарадзіўшыся, дзіця мае добра сфарміраваныя імунныя рэакцыі.

## Рабіць ці не

***— Працаўнікі прышчэпак часта прыводзяць свае доказы: яны, быццам бы, ламаюць імунітэт, выклікаюць аўтызм...***

— Пра антыпрышчэпачнікаў можна сказаць дзве рэчы: іх мала, але яны вельмі гучныя. Я перыядычна вяду амбулаторны прыём, кожны дзень у клініцы размаўляю з бацькамі. Праціўнікаў прышчэпак мала, ёсць людзі, якія сумняваюцца і просяць дадатковую інфармацыю, каб прыняць уласнае рашэнне. І гэта правільна. Бацькі адказваюць за здароўе дзіцяці. Таму яны павінны разумець рызыкі таго, што зробяць і чаго не зробяць. Чым меншае дзіця, тым складаней праходзяць усе інфекцыі. Калі бацькі вырашаюць адкласці прышчэпку і дачакацца, што нешта памяняецца, то павінны ўсведамляць рызыку: яны пакідаюць дзіця неабароненым у тым узросце, калі хваробы праходзяць вельмі цяжка. Задача доктара — даць бацькам інфармацыю для разважання: аб бяспецы прышчэпак, ад чаго яны абараняюць, а вырашаць бацькам. Тое, што мы адыходзім ад савецкага патэрналісцкага падыходу «Доктар сказаў — пацыент зрабіў», на мой погляд, правільна. Я вітаю, калі бацькі задаюць пытанні.

***— Ці трэба праходзіць дадатковыя абследаванні перад прышчэпкай?***

— Для большасці прышчэпак дадатковых абследаванняў не патрабуецца, бо яны сёння дастаткова бяспечныя. Дарэчы, я заўсёды параўноўваю частату пабочных рэакцый на прышчэпку і гарачкапаніжальнае — ібупрафен ці парацэтамол. Бацькі, як правіла, не ведаюць, што прышчэпкі нашмат больш бяспечныя, чым названыя сродкі. Важнае не столькі тое, што мы робім да прышчэпкі, колькі тое, што пасля. Абавязкова трэба пасядзець пад кабінетам урача паўгадзіны. Бо такое ўскладненне, як анафілактычны шок, здараецца ў першыя хвіліны пасля прышчэпкі. У кожнага доктара ў кабінеце ёсць укладка неабходных медыкаментаў для такіх рэакцый, і ён ведае, як іх правільна ўвесці.

***— Ці варта рабіць прышчэпку ад грыпу?***

— Прышчэпка ад грыпу абараняе ад грыпу, а не ад іншых прастудных інфекцый. Часта бацькі чакаюць, што дзіця не будзе хварэць ні на якія прастудныя інфекцыі. Гэта не так. Але чаму важна абараніць дзіця ад грыпу? Гэта самая цяжкая прастудная інфекцыя, ад якой штогод у развітых краінах паміраюць і дзеці, і дарослыя. Акрамя таго, грып у дзяцей нашмат часцей, чым іншыя прастудныя інфекцыі, прыводзіць да бактэрыяльных ускладненняў. 40 % дзяцей да трох гадоў пасля перанесенага грыпу захварэюць вострым сярэднім атытам.

***— Магчыма, у найбліжэйшыя гады ў нашым календары з'явяцца новыя прышчэпкі?***

— Абмяркоўваецца для ўключэння ў нацыянальны каляндар пнеўмакокавая вакцына. Пакуль яе робяць толькі дзецям з груп рызыкі. Ёсць яшчэ некалькі вакцын з календароў тых краін, на якія арыентуецца ўвесь свет, напрыклад ЗША ці Вялікабрытанія. У іх ёсць прышчэпкі ад ротавіруснай інфекцыі, ветранай воспы, папіломавіруса, якія можа выклікаць рак шыйкі маткі. У нашым календары іх пакуль няма, але медыцынская грамадскасць абмяркоўвае магчымасць іх уключэння.

**Алена КРАВЕЦ.**


**РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 26.10.2018 повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества**

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 720/С-15556 общей площадью 30,8 кв. м, расположенное по адресу: Могилевска обл., Горецкий р-н, г. Горки, гаражный кооператив «Белый ручей», гараж № 50Л. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж 50Л. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 722050100001006633 площадью 4,4454 га. **Начальная цена продажи – 3 909,6 рубля, задаток – 390,96 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27125 общей площадью 81,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: здание контрольно-пропускного пункта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000678 площадью 4,5076 га. **Начальная цена продажи – 34 603,2 рубля, задаток – 3 460,32 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27117 общей площадью 926,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: здание склада, гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000678 площадью 4,5076 га. **Начальная цена продажи – 82 231,2 рубля, задаток – 8 223,12 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27128 общей площадью 671,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: здание вспомогательного корпуса. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000678 площадью 4,5076 га. **Начальная цена продажи – 64 346,4 рубля, задаток – 6 434,64 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-68376 общей площадью 149,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, пер. 4-й Новый, д. 5А. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: бытовые помещения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000080 площадью 1,3627 га. **Начальная цена продажи – 38 782,8 рубля, задаток – 3 878, 28 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27123 общей площадью 32,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: мойка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000678 площадью 4,5076 га. **Начальная цена продажи – 4 568,4 рубля, задаток – 456,84 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-141731 общей площадью 641,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Подгорная, 10. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: здание наплавки валов. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000001000529 площадью 6,8363 га. **Начальная цена продажи – 164 268,00 рубля, задаток – 16 426,8 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-59051 общей площадью 916,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, д. Ковердяки, ул. Трудовая, 67А. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: обменный пункт. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121283004101000306 площадью 0,5060 га. **Начальная цена продажи – 141 912,00 рубля, задаток – 14 191,2 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-7240 общей площадью 1264,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Мозырь, ул. Коммунальная, 2. Назначение: здание деревообрабатывающего цеха, наименование: одноэтажное кирпичное здание деревообрабатывающего цеха. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000006000288 площадью 2,6200 га. **Начальная цена продажи – 267 202,8 рубля, задаток – 26720,28 рубля. Шаг аукциона – 5 %**

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ

**Аукцион состоится 26.10.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 26 октября 2018 года.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений 23.10.2018 в 14.00.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**



**Управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Замосточанское» (УНП 300013756)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1.<br>капитальное строение с инв. № 225/С-17719 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, расположенное по адресу: Витебская область, Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, аг. Замосточье, ул. Механизаторская, 3. Начальная стоимость 6935 белорусских рублей. |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Местонахождение имущества | Витебская область, Докшицкий р-н, д. Замосточье, ул. Механизаторская, 3 |
| Место, дата и время проведения торгов | 12.11.2018 в 10.00, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by).<br>Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел./факс: (80212) 62 03 40, (8033) 6879163 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 09.11.2018 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

Сямейная газета
Выпуск № 19 (110)

# КАЛІ ЦЯБЕ ЛЮБЯЦЬ

У вестыбюлі школы, дзе вучыцца старэйшая дачка, традыцыйна зладзілі выстаўку работ вучняў малодшых класаў, якія намалявалі сваіх матуль. Настаўніцы, медсёстры і ўрачы, бухгалтаркі, прадавачкі... Ёсць нават супрацоўніца Выдавецкага дома «Звязда» — і гэта нават не я, бо дачка ўсё ніяк не вырашыцца перадаць алоўкамі і фарбамі мой светлы вобраз ды вынесці карціну на публіку. (Затое дома захоўваюцца пачкі кардонак, аркушаў, папер і паперачак, размаляваных часам з абодвух бакоў самымі рознымі партрэтамі, ад крамзоляў «палка, палка, агурок» да незнаёмых прынцэс у каронах і пышных сукенках, якіх аб'ядноўвае толькі подпіс «мама».)

Зразумела, у школьнай партрэтнай галерэі ніхто не ацэньвае мастацкую вартасць работ, тут галоўнае — эмацыянальны пасыл. Час ад часу бачу, як бацькі з першаклашкамі спыняюцца каля сцяны і ўважліва разглядаюць выстаўку: нехта раўніва заўважае «а я лепш магу!», нехта просіць сфатаграфавацца на фоне, нехта натхняецца ўбачаным і абяцае вось сёння, хоць проста зараз, таксама намаляваць любімую мамачку ды бабулечку. А як прыемна і радасна да вільгаці ў вачах напярэдадні Дня маці бачыць малых, якія беражліва прыціскаюць да грудзей партрэты ці пластылінавыя букеты, ці самаробныя паштоўкі, ці букеты з восеньскіх кветак ды каляровай лістоты і гатовыя падзяліцца нават з незнаёмай дарослай цёткай: «Гэта я ма-а-аме нясу!»

Мая мама дагэтуль захоўвае ў шуфлядзе ў спецыяльным пакецiку частку нашых з сёстрамі падарункаў, сярод якіх і раддомаўскія рудыя біркі, і першыя малюнкі з дзіцячага садка, і выпалены на фанерцы, а потым старанна, хоць і не надта акуратна, расфарбаваны букет, і нейкія граматы ды падзякі, пра якія мы самі думаць забыліся, і бранзалет з пацерак, для вырабу якога давялося ўпотай распусціць некалькі нітак маміных жа пацеркавых караляў... Яшчэ гадоў 10—15 таму мы спрачаліся, ці варта ўсё гэта захоўваць, але мама цвёрда адказвае, што — так, варта, бо ўсе мы, незалежна ад узросту, застаёмся яе дзецьмі. «Вось свае з'явяцца — зразумееце», — з усмешкай пакідала яна за сабой апошняе слова. І, як вельмі часта бывае ў размовах бацькоў і дзяцей, мела рацыю. Цяпер ужо я сама старанна складаю ў шафу паперы і паперкі, бо гэта не макулатура, гэта — падарункі для мамы. І вельмі карысна часам, асабліва калі насварышся на дзіця і ў глыбіні душы разумееш уласную неправату, перабраць гэты запаветны стос, разабраць крывабокія літары... І наноў усвядоміць, што калі цябе так любяць, то трэба, хоць часам і складана, быць гэтага вартай і ў сваю чаргу паказваць дзецям, што ты іх — таксама, заўжды, не за штосьці, а па факту існавання...

Таму няхай сабе мама тэлефануе проста так, без справы і паўгадзіны расказвае рэцэпт нейкіх цуда-закатак з кабачкоў або суседскія навіны або нагадвае, што трэба надзець шапку — незалежна ад таго, 14 вам гадоў ці 44. Няхай сабе дзіця па пяць разоў на дзень задае ў тэлефон адно і тое ж пытанне: «Прывітанне, мама, як твае справы?» Усё добра. Усё будзе добра, пакуль вы ёсць і любіце адно аднаго.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# У АДНУ РАКУ ТРОЙЧЫ



**Гісторыя гэтай сталічнай сям'і падобная на сучасную казку. Жылі-былі муж з жонкай і было ў іх тры сыны — Альгерд, Георгій і Яўген... Казачнасць у тым, што нарадзіліся хлопцы ў адзін дзень!**

## МАГІЧНАЯ ЛІЧБА

Для Ігара і Кацярыны Лапікавых 19 чэрвеня — дата асаблівая. Сёлета ў гэты дзень іх старэйшаму сыну споўнілася пяць, сярэдняму — тры, а малодшы ўпершыню пабачыў белы свет.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Шануй сваё!

# ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ... У СМАРТФОНЕ

## Выйшла першая мабільная дзіцячая гульня па-беларуску

**Не так даўно з'явілася першая беларускамоўная гульня для тэлефонаў — мабільная Біблія для дзяцей. Гэта адмысловая праграма, зробленая ў форме падарожжа з 41 анімаванай гісторыяй. Дзякуючы ёй дзеці могуць у займальнай форме азнаёміцца з даўнімі, але важнымі для сучаснага жыцця падзеямі, а таксама разгадаць адмысловыя галаваломкі, адказаць на некаторыя цікавыя пытанні. Пра тое, як удалося зрабіць такую маштабную гульню, і пра тое, што ж яна сабой уяўляе, я пагутарыла з кіраўніком праекта Мікалаем МАЛАШЧОНКАМ.**

***— На які дзіцячы ўзрост разлічана гэта гульня?***

— Яна для дзяцей 6-8 гадоў. Аднак будзе цікавая і больш маленькім, калі бацькі нешта пакажуць, растлумачаць і пагуляюць з імі разам. Гульня складаецца з кароткіх мульцікаў і невялікіх інтэрактыўных заданняў.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Кастуся ДРОБАВА.

# МАМА ПАВІННА БЫЦЬ У КОЖНАГА!

**Напярэдадні святкавання Дня маці мы хацелі б успомніць жанчын, якія, нават калі і не нарадзілі самі, усё роўна з'яўляюцца мамамі. Размова пойдзе пра тых, хто гадуе чужых дзяцей і любіць іх, як родных. Кожнае малое мае патрэбу ў сям'і і любові, але ў сілу розных абставін некаторыя не маюць гэтага. У Нацыянальным цэнтры ўсынаўлення «Звяздзе» расказалі аб тым, якім чынам дзетдомаўскае дзіця можа трапіць на выхаванне ў сям'ю і чым адзін спосаб адрозніваецца ад іншага.**

Згодна з нашым заканадаўствам існуюць наступныя віды ўладкавання гэтых дзяцей: усынаўленне, апякунская сям'я і прыёмная сям'я, дзіцячы дом сямейнага тыпу.

## Усынаўленне

Усынаўленне лічыцца прыярытэтнай формай уладкавання дзіцяці-сіраты. Гэта асаблівы шлях бацькоўства, заснаваны на прыняцці чужога дзіцяці як свайго, роднага. У выніку ўсынаўлення паміж усынавіцелем і ўсыноўленым узнікаюць такія ж правы і абавязкі, як паміж крэўнымі бацькамі і іх дзецьмі.

Дзіця прымае вашае прозвішча і імя па бацьку. Пры жаданні можна памяняць нават дату нараджэння (але не больш чым на адзін год) і месца яго нараджэння (у межах Беларусі). Такое дзіця мае ўсе правы на спадчыну. А яго былыя родныя ніколі не даведаюцца, дзе яно.

Усынаўленне афармляецца праз суд. Пры гэтым розніца ва ўзросце паміж усынавіцелем і дзіцем павінна быць не менш за шаснаццаць і не больш за сорак пяць гадоў.

Упраўленне (аддзел) адукацыі па месцы жыхарства на працягу першых трох гадоў пасля ўсынаўлення кантралюе ўмовы жыцця і выхавання дзіцяці ў сям'і.

## Апека і папячыцельства

Апека — гэта прыняцце ў дом дзіцяці на правах выхаванца.

Апека ўстанаўліваецца над дзецьмі ва ўзросце да 14 гадоў, а папячыцельства — над непаўналетнімі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Пад апеку (папячыцельства) дзяцей часта бяруць сваякі, якія маюць пераважнае права перад іншымі асобамі.

Апека можа быць прызначаная на пэўны тэрмін або без тэрміну. Афармляецца ў адміністрацыйным парадку. Дзіця пры гэтым не мяняе прозвішча, не лічыцца вашым і можа мець зносіны з былымі сваякамі.

Калі з'явяцца людзі, якія пажадаюць усынавіць гэта дзіця, яго забяруць. За працэсам выхавання сочаць органы апекі, якія праводзяць кантрольныя абследаванні ўмоў жыцця падапечных не радзей за два разы на год.

На апякаемае дзіця выплачваецца штомесячная дапамога. Сумы, што атрымлівае падапечны ў якасці пенсій, дапамог, аліментаў і іншых бягучых паступленняў, накіроўваюцца ў распараджэнне апекуна або папячыцеля і выдаткоўваюцца ім на ўтрыманне гэтага падапечнага.

## Прыёмная сям'я

Прыёмная сям'я — форма выхавання дзіцяці (дзяцей) у сям'і дома ў прыёмнага бацькі (маці) — выхавацеля. Яе яшчэ часта называюць «сямейным дзіцячым домам».

Звычайна ў прыёмную сям'ю перадаюць дзяцей, якіх немагчыма перадаць на ўсынаўленне або пад апеку сваякам. Такая сям'я замяняе знаходжанне дзіцяці ў дзіцячым доме на хатняе выхаванне і ствараецца на аснове дагавора паміж прыёмнымі бацькамі і органамі апекі. Тэрмін знаходжання дзіцяці ў такую сям'ю вызначаецца дагаворам і можа быць розны. На практыцы дагавор аб прыёмнай сям'і заключаецца да паўналецця дзіцяці.

У прыёмных сем'ях можа выхоўвацца ад аднаго да васьмі дзяцей, уключаючы родных дзяцей. Прыёмным бацькам плаціцца заробак і залічваецца працоўны стаж. У адносінах да дзіцяці прыёмныя бацькі з'яўляюцца яму апекунамі.

На дзіця выплачваецца штомесячная дапамога, даюцца льготы па транспартным абслугоўванні. Пасля таго як яму міне 18 гадоў, вылучаецца жыллё, калі яго няма. Але органы апекі пастаянна кантралююць выхаванне і расходаванне сродкаў.

## Ёсць і яшчэ адзін шлях — патранатнае выхаванне

Патранатнае выхаванне прадугледжвае ўдзел грамадзян у выхаванні дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Яно падыходзіць тым, хто хоча паўдзельнічаць у жыцці дзіцяці, што расце без сям'і, стаць сябрам малому, якое жыве ў дзіцячым доме або інтэрнаце.

У гэтым выпадку можна:

- ✓ наведваць дзіця ва ўстанове;
- ✓ прымаць дзіця ў сваёй сям'і ў выхадныя і дні канікул;
- ✓ даць магчымасць дзіцяці хоць на кароткі перыяд пажыць у клапатлівай сям'і, падзяліцца з ім сваім жыццёвым вопытам (навучыць гатаваць, рабіць пакупкі, дапамагчы ў выбары будучай прафесіі);
- ✓ прыняць дзіця, якое часова мае патрэбу ў сям'і. Такому дзіцяці з розных прычын альбо немагчыма, альбо пакуль не ўдаецца знайсці сям'ю на больш доўгі тэрмін. Як правіла, гаворка ідзе пра дзяцей падлеткавага, магчыма, юнацкага ўзросту, альбо аб дзецях, якія маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця, ці аб тых, хто часова знаходзіцца ў дзіцячых інтэрнатных установах.

Абавязкі патранатнага выхавання выконваюцца на бязвыплатнай аснове. А апека, папячыцельства над такімі дзецьмі захоўваюцца за кіраўнікамі дзіцячых інтэрнатных устаноў, устаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі (калі дзіця там вучыцца).

Кантроль за ўмовамі выхавання і ўтрымання такіх дзяцей ажыццяўляецца органамі апекі і папячыцельства.

І хоць збоку можа здацца, што гэта добры варыянт дапамагчы канкрэтнаму дзіцяці, калі з нейкіх прычын дарослы чалавек ці сям'я не можа ці не хоча даць яму большага, трэба адзначыць і падводныя камяні патранатнага выхавання, якія могуць праявіцца з цягам часу.

Так, можа здарыцца, што дзіця стане спадзявацца, што патранатны выхавальнік яго ў рэшце рэшт усынавіць, прыме ў сям'ю назаўсёды. Часта ў гэтым выпадку дзіця можа сумаваць, трапляючы ў сям'ю, нават у моманты агульнай весялосці. Так яно будзе перажываць хуткую перспектыву вяртання ў дзіцячы дом, расставання з вясёлай і вясёлай сям'ёй.

Ну і, вядома, дзіцяці можа быць балюча вяртацца назад у дзіцячы дом пасля добра праведзеных «сямейных вакацый» або «сямейных выходных», і яно будзе цяжка перажываць расставанне. Так што тут таксама трэба ўзважыць усе «за» і «супраць» такой, на першы погляд, вельмі добрай справы.

**Як нам паведаміла галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА, у Беларусі з 2010 года амаль удвая зменшылася колькасць дзяцей, бацькі якіх пазбаўленыя бацькоўскіх правоў. Так, калі ў 2010 годзе гэтая лічба складала 2683 дзіцяці, то па выніках 2017 года — каля 1400.**

**У нашай краіне налічваецца 283 жанчыны, якія маюць прафесію «маці-выхавальніца» і працуюць у дзіцячых дамах сямейнага тыпу. Гэта жанчыны, якія, акрамя выхавання родных дзяцей, дораць раўназначныя ўвагу і клопат дзецям, што страцілі апеку ўласных бацькоў. Кожная з іх выпускае ў дарослае жыццё дзясяткі дзяцей (адначасова ў доме сямейнага тыпу могуць выхоўвацца да дзесяці дзяцей, і калі яны пакідаюць яго сцены, пад крыло мамы-выхавальніцы трапляюць новыя).**



# Як дзяржава падтрымлівае сем'і, што ўсынавілі дзяцей

**Бывае, сям'я падумвае аб усынаўленні, але баіцца магчымых цяжкасцяў, што могуць абрынуцца, як толькі прыме на сябе ўсю паўнату адказнасці за выхаванне і матэрыяльнае ўтрыманне дзіцяці. Але варта мець на ўвазе, што сям'я, якая ўсынавіла дзіця, мае роўныя правы з сям'ёй, што выхоўвае крэўных дзяцей. Гэта значыць у тым ліку, што яна мае права на ўсе дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.**

— Напэўна, самай шырока распаўсюджанай выплатай, якой карыстаецца каля 70 % сем'яў, што ўсынавілі дзяцей, з'яўляецца выплата на ўтрыманне ўсыноўленага дзіцяці, — кажа **дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Вольга ГЛІНСКАЯ.** — У нашай краіне атрыманне такой выплаты гарантуецца дзяржавай да дасягнення дзіцем шаснаццацігадовага ўзросту.

А якімі яшчэ дапамогамі можна скарыстацца пасля ўсынаўлення або ўдачарэння дзіцяці?

## Калі вы ўсынавілі дзіця ва ўзросце да трох месяцаў

У адпаведнасці з артыкулам 7 Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», жанчынам, што ўсынавілі дзяцей ва ўзросце да трох месяцаў, прызначаецца дапамога па цяжарнасці і родах. Дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца на 70 каляндарных дзён з дня ўсынаўлення.

## Калі вы ўсынавілі дзіця ва ўзросце да шасці месяцаў

Згодна з артыкулам 11 Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці маюць маці ці бацька дзіцяці, а таксама асоба, якая ўсынавіла дзіця ва ўзросце да 6 месяцаў. Гэта дапамога прызначаецца і выплачваецца на кожнае дзіця аднаразова пры нараджэнні альбо ўсынаўленні.

Выплаты прызначаюцца ў выпадку, калі дзіця на момант усынаўлення не дасягнула шасцімесячнага ўзросту. Калі пры ўсынаўленні рашэннем суда дзіцяці зменена дата нараджэння, але на момант усынаўлення яму было больш за шэсць месяцаў, такая дапамога не назначаецца.

## Калі ўсыноўленае вамі дзіця малодшае за тры гады

Згодна з артыкулам 185 Працоўнага кодэкса Беларусі пры ўсынаўленні дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў усынавіцелю ці іншаму члену сям'і, які фактычна ажыццяўляе догляд за ўсыноўленым дзіцем, даецца водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў з захаваннем права на атрыманне штомесячнай дзяржаўнай дапамогі.

З 1 студзеня 2015 года ўстаноўлена штомесячная дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад трох да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў — у памеры 50 % найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за два апошнія кварталы.

Дата нараджэння дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў (да 1 студзеня 2015 года або пасля гэтай даты), а таксама занятасць альбо незанятасць бацькоў на права атрымання гэтай дапамогі не ўплываюць.

## Калі ўсыноўленае вамі дзіця малодшае за 16 гадоў

Згодна з Указам Прэзідэнта № 330 ад 30.06.2014 года «Аб дзяржаўнай падтрымцы сем'яў, якія ўсынавілі (удачарылі) дзяцей» устаноўлены штомесячныя грашовыя выплаты на дзяцей, усыноўленых асобамі, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі.

Такія выплаты ажыццяўляюцца са згоды ўсынавіцеляў з дня ўступлення ў сілу рашэння аб усынаўленні дзіцяці і да дасягнення ім узросту 16 гадоў, на падставе рашэння мясцовага выканкама. Для прызначэння выплат трэба звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган (аддзел адукацыі, спорту і турызму па месцы жыхарства).

Такія выплаты робяцца выключна па заяве ўсынавіцеляў. Пры гэтым Вольга Глінская рэкамендуе не зацягваць з падачай заявы і звяртацца па прызначэнне выплаты адразу пасля атрымання рашэння суда аб усынаўленні, новага пасведчання аб нараджэнні і рэгістрацыі дзіцяці па месцы жыхарства. У гэтым выпадку выплата будзе прызначаная з моманту ўступлення ў сілу рашэння суда аб усынаўленні. Калі заява будзе пададзена нашмат пазней, выплаты прызначаць з моманту падачы такой заявы. Таксама варта мець на ўвазе, што пазаказаная выплата прызначаецца незалежна ад іншых выплат, на якія маюць права сем'і, што выхоўваюць дзяцей.

Таксама асобы, якія ўсынавілі дзіця ва ўзросце ад трох да 16 гадоў, маюць права на кароткачасовы водпуск без захавання заработнай платы тэрмінам да 90 каляндарных дзён на працягу шасці месяцаў з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб усынаўленні. У выпадку выкарыстання ўсынавіцелем кароткачасовага водпуску без захавання зарплаты працягласцю не менш за 30 каляндарных дзён — штомесячныя грашовыя выплаты за першы месяц, што прыпадае на такі адпачынак, выплачваюцца ў падвойным памеры пры падачы ўсынавіцелем у мясцовы выканкам копіі загада аб адпачынку.

Калі ўсыноўленае вамі дзіця было біялагічным сіратой, гэта значыць, яго адзіны або абодва бацькі памерлі, у такім выпадку яно мела права на пенсію з прычыны страты карміцеля ці ўжо атрымлівала такую пенсію.

Пасля ўсынаўлення права на атрыманне пенсіі па страце карміцеля ў дзіцяці захоўваецца. Па пытанні пераафармлення (афармлення) такой пенсіі вам неабходна звярнуцца ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне выканкама.

## Правы на сямейны капітал

Згодна з Указам Прэзідэнта № 572 ад 09.02.2015 года пры ўсынаўленні трэцяга і наступных дзяцей, дата нараджэння якіх не раней чым 1 студзеня 2015 года, сям'і будзяляюцца безнаяўныя грашовыя сродкі ў памеры 10 тысяч долараў ЗША — сямейны капітал. Майце на ўвазе, што сям'я можа рэалізаваць права на прызначэнне сямейнага капіталу адзін раз.

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

Рэзанансная тэма

# КРЫНІЦА ГВАЛТУ — ЧАЛАВЕК,

## або Як і ці трэба абараняць беларусаў ад саміх сябе

**«Эканамічны гвалт», «пераследаванне» і «дамаганне», афіцыйная забарона біць дзяцей і іншыя наваўвядзенні і тэрміны маглі з'явіцца ў Беларусі, калі б у краіне зацвердзілі распрацаваную ў Міністэрстве ўнутраных спраў (МУС) канцэпцыю праекта закона «Аб супрацьдзеянні хатняму гвалту». Але падрыхтаваны дакумент жорстка раскрытыкавалі і Прэзідэнт, і розныя афіцыйныя ведамствы, і звычайныя беларусы.**



### Сям'я: каштоўнасць ці небяспека

У МУС лічаць, што канцэпцыя накіравана на ўмацаванне традыцыйных для беларускага грамадства сямейных каштоўнасцяў. Іх апаненты настойваюць, што прапанаваныя ідэі ўводзяць новую крымінальную адказнасць і падрываюць само паняцце сям'і.

— Некаторыя наваўвядзенні гэтай канцэпцыі змяняць усё наша жыццё, калі яны будуць прынятыя. Пачынаючы ад уладкавання нашай сям'і і ўзаемаадносін паміж дзецьмі і бацькамі і паміж мужам і жонкай і заканчваючы стасункамі паміж людзьмі ў грамадстве. Некаторыя моманты канцэпцыі змяняць самі асновы нашага грамадства, — упэўнены **Пётр ШАПКО, старшыня аб'яднання «Горад без наркотыкаў»**. — Апошні год у прэсе тэма хатняга гвалту так шырока абмяркоўваецца, што ў многіх грамадзян, пэўна, ужо склалася меркаванне, што сям'я — самае небяспечнае месца для існавання чалавека.

Канцэпцыя мае каласальны дысбаланс паміж правамі і абавязкамі мужчын, якія часцей за ўсё падаюцца як агрэсары, і жанчын, якія пазіцыянуюцца як ахвяры. А бацькі, як правіла, падаюцца наўмыснымі крыўдзіцелямі сваіх дзяцей. Праектам гэтага дакумента справы хатняга гвалту фактычна выводзяцца за межы адміністрацыйнага і крымінальнага працэсу — адзінага спосабу з дапамогай закону высветліць, якія адбываліся падзеі, лічыць **Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы**, і дадае, што пэўныя прапановы канцэпцыі супярэчаць і Кодэксу аб шлюбе і сям'і, і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі:

— Распрацаваная органамі Міністэрства ўнутраных спраў канцэпцыя — шкоднае і небяспечнае сатрасенне паветра. Гэта антыканстытуцыйны дакумент, што супярэчыць беларускаму заканадаўству. Ёсць фундаментальныя правы, гарантаваныя чалавеку дзяржавай. І адно з такіх правоў і каштоўнасцяў — сям'я — саюз мужчыны і жанчыны.

### Гвалт эканамічны, сексуальны і фізічны

Якія ж прапановы канцэпцыі выклікаюць найбольшае абурэнне і чаму? Ёсць прэтэнзіі да расшырэння паняцця «гвалт». У канцэпцыі выкладзены азначэнні паняццяў «хатні гвалт», «сексуальны гвалт» і «фізічны гвалт». Пад эканамічным, у прыватнасці, разумеюцца наўмысныя дзеянні, якія ставяць чалавека ў залежнасць праз пазбаўленне яго жылля, ежы, грошай, а таксама калі яму забараняюць працаваць ці вучыцца.

— Я не ўбачыў у канцэпцыі дакладных дэфініцый! Што такое псіхалагічны гвалт? Нельга пражыць усё жыццё ў шлюбе і ні разу не пасварыцца. А што такое эканамічны гвалт? Не даў грошай на брыльянты? — эмацыянальна выказваецца Ігар Марзалюк.

Незадаволены спецыялісты і павелічэннем магчымасцяў прадстаўнікоў МУС і старонніх людзей, уключаючы грамадскія аб'яднанні, умешвацца ва ўнутраныя справы сем'яў, што таксама вынікае з канцэпцыі. Такое пашырэнне магчымасцяў для нашай краіны беспрэцэдэнтнае, падкрэсліў Пётр Шапко.

Выклікае эмоцыі і прапанаванае рашэнне пашырыць кола асоб, на якіх будзе распаўсюджвацца работа па папярэджанні хатняга гвалту. Гэта не толькі тыя, хто жыве разам і вядзе сумесную гаспадарку, а і былыя муж і жонка і дарослыя дзеці.

Афіцыйная забарона біць дзяцей — норма, якая таксама не павінна была стаць рэвалюцыйнай, бо вядома ж, што так рабіць у прынцыпе нельга і непедагагічна. Аднак гэта таксама выклікала шчырае абурэнне. «Чаму я як бацька не маю права пакараць сваё дзіця, я не маю на ўвазе фізічнае пакаранне, за рэчы, якія яно робіць няправільна?» — задаецца пытаннем дэпутат.

У канцэпцыі прапанаваны і спосабы абароны ад агрэсараў. Крыўдзіцель павінен будзе пакінуць дом на 15 сутак, узяўшы толькі асабістыя рэчы і пакінуўшы ключы ад кватэры пацярпелым. Мяркуецца, што агрэсару вынесуць абароннае прадпісанне і забароняць высвятляць месца знаходжання яго ахвяры, а таксама мець з ёй стасункі і распараджацца сумеснай маёмасцю. Хатні гвалтаўнік мусіць прайсці спецыяльную карэкцыйную праграму, скіраваную на змяненне паводзін. Канцэпцыя прадугледжвае, што дзеці, пацярпелыя ад гвалту, па магчымасці будуць з'язджаць да сваякоў, пакуль будуць вырашацца сямейныя праблемы.

### Пункт невяртання

Думаецца аднак, што, колькі б законаў ні існавала і як бы ні гучалі іх фармулёўкі, усё адно самае галоўнае — тое, як яны прымяняюцца на практыцы і наколькі дзейснымі застаюцца для людзей. Напрыклад, вызначыць межы, дзе канчаецца сямейная сварка і пачынаецца метадычнае штодзённае зневажанне (чытай — псіхалагічны гвалт), вельмі цяжка, і ў кожным выпадку межы свае, іх не прапісаць ніякімі канцэпцыямі.

— У некаторых еўрапейскіх краінах канцэпцыі падобнага тыпу былі прынятыя, аднак наступствы іх прымянення за апошнія 10—15 гадоў не вывучаліся. Значыць, распрацоўшчыкі іх не даследавалі і, на маю думку, гэта памылка, — дадаў старшыня аб'яднання «Горад без наркотыкаў». — Прапанаваная нам канцэпцыя заснавана на замежным вопыце, а замежны вопыт базуецца на Стамбульскай канвенцыі.

Улічваючы крытыку на ўсіх узроўнях, канцэпцыя, наўрад ці будзе прынятая. Аднак застаецца пытанне: што рабіць, каб супрацьдзейнічаць хатняму гвалту? З аднаго боку, нельга замоўчваць праблему яго існавання. З другога — не трэба перабольшваць яе маштабы, заклікаюць спецыялісты.

— Сённяшняе заканадаўства гарантуе нармальнае чалавечае існаванне і ўсе правы ў межах сям'і і за яе перыметрам. Я не разумею, навошта прыдумваць дадатковы заканадаўчы акт, калі дастаткова сучасных інструментаў, каб пакараць дэбашыра, гвалтаўніка, хулігана, у тым ліку і таго, што займаецца хатнім хуліганствам, — здзіўляецца Ігар Марзалюк. — Мяне абражае рэклама ў беларускіх супермаркетах з плакатамі, адкуль я даведаўся, што жыву ў краіне паталагічных сямейных садыстаў. Калі чытаю, што трое з чатырох беларусаў зазналі хатні гвалт, я не разумею, адкуль гэтыя лічбы, наколькі бездакорная гэтая сацыялагічная статыстыка. Калі гэта вынік судовых расследаванняў, то ці пакараныя агрэсары?

Разам з тым у МУС сведчаць, што ў органы ўнутраных спраў штогод паступае каля 120 тысяч зваротаў аб хатнім гвалце, або кожны дзясяты зварот. І гэта толькі зафіксаваныя лічбы. Штогод каля 100 чалавек гінуць ад рук сваякоў, а гэта кожная трэцяя смерць ад гвалтоўных дзеянняў іншых людзей. А яшчэ статыстыка сведчыць, што каля 80 % гвалту ў сям'і здзяйсняецца пад уплывам алкаголю.

— Калі мы гаворым пра выкараненне хатняга гвалту як з'явы, то, на нашу думку, ніякіх рэальных спосабаў барацьбы канцэпцыя ў сабе не нясе. Калі мы хочам дасягнуць выніку ў супрацьстаянні гвалту ў сям'і, то трэба зразумець, што яго крыніца — не мужчына, не жанчына, не дзіця, а чалавек. І ад таго, якія якасці закладзены ў малое, будуць залежаць усе яго сацыяльныя стасункі ў дарослым жыцці і яго ўплыў на наша жыццё. І менавіта на гэта трэба скіраваць дзяржаўныя праграмы, — упэўнены Пётр Шапко. — Галоўнае — не перайсці пункт невяртання, за якім, як паказвае гісторыя, ідзе знікненне народа.

**Ірына СІДАРОК.**

Карысная шпаргалка

# Як захаваць вітамін С у агародніне падчас гатавання

**Даныя па вывучэнні харчавання дзяцей у Беларусі сведчаць, што вельмі часта школьнікі і дашкольнікі не атрымліваюць неабходныя ў іх узросце рэчывы — бялок, вітаміны і мінеральныя солі, кальцый. Іх дэфіцыт з часам вядзе да розных захворванняў.**

— Незбалансаванасць амінакіслотнага складу ежы вядзе да нізкай забяспечанасці арганізма бялком. Празмернае ўжыванне тлустых страў і ласункаў, а менавіта гэтымі прадуктамі перш за ўсё імкнуцца дапоўніць харчаванне дома бацькі, вядзе да парушэння абмену рэчываў, а з часам і да розных хвароб, — расказвае **загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ**. — Нястача ў рацыёне агародніны, парушэнне тэхналогіі яе прыгатавання пазбаўляе дзяцей неабходнай колькасці вітамінаў і мінеральных соляў. У хатніх умовах гэтыя недахопы ўзмацняюцца яшчэ і тым, што ежа нярэдка гатуецца на два дні. Доўгае яе захоўванне разбурае вітамін С, пагаршае засваенне іншых яе інградыентаў. Недастатковае ўжыванне малака і тварагу вядзе да недахопу кальцыю ў арганізме. Мы назіраем яго рэзкі дэфіцыт асабліва ў дзяцей падлеткавага ўзросту. І ў дзіцячых установах, і дома яшчэ недастаткова і часам няправільна выкарыстоўваецца алей, з-за чаго дзіця пазбаўлена важных у фізіялагічных адносінах поліненасычаных тлустых кіслот.

Нашы з вамі памылкі ў харчаванні можна пералічваць бясконца. У новай рубрыцы «Карысная шпаргалка» для бацькоў і ўсіх ахвотных мы раскажам пра сакрэты здаровага харчавання і правільнае прыгатаванне ежы. Калі ў вас ёсць пытанні з гэтай нагоды, задавайце. На іх адкажуць педыятры і дыетолагі.

### Не знішчыць далікатны вітамін

Сёння мы раскажам пра метады і хітрыкі, якія дазволяць захаваць як мага больш каштоўнага вітаміну С.

1. Агародніну падчас варкі апускаюць у кіпячую падсоленую ваду.

Падчас прыгатавання супоў агародніну закладваюць у гатовы кіпячы булён (мясны, рыбны, грыбны) у такой паслядоўнасці, каб яна не пераварылася. Капусту апускаюць у кіпячую ваду часткамі, каб вада адразу закіпала зноў, і не пераварваюць. Зялёны гарошак і буракі ў салёнай вадзе не вараць, паколькі гарошак такім чынам доўга не разварваецца, а буракі губляюць свае смакавыя якасці.

2. Агародніну пакрываюць вадой ці булёнам цалкам. Нельга папаўняць вадкасць, якая выкіпела, халоднай вадой. Кісларод, які паступае з вадой, акісляе вітамін С і зніжае яго колькасць.

3. Нельга часта размешваць змесціва каструлі. Пры неабходнасці гэта робяць асцярожна, не дастаючы агародніну з вадкасці, каб пазбегнуць яе кантакту з паветрам.

4. Агародніну (моркву, буракі, бульбу), прызначаную для прыгатавання халодных страў (салатаў, вінегрэтаў), вараць у неачышчаным выглядзе ў вадзе ці на пары.

5. Адвары ачышчанай агародніны выкарыстоўваць для прыгатавання першых страў, соусаў і падліваў. У іх змяшчаюцца вітамін С, некаторыя вітаміны групы В, солі калію і іншыя мінеральныя рэчывы.

6. Падчас прыгатавання кампотаў і кісялю са свежазамарожаных ягад і фруктаў іх абмываюць праточнай вадой, не размарожваючы, і адразу ж кладуць у кіпень. Так лепш захоўваецца вітамін С. Калі фрукты размарозіць на паветры да варкі, вітамін С цалкам разбурыцца.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Нататкі шматдзетнага таткі



# Завуч у тралейбусе ёсць?

Поля:

— У маёй сяброўкі з класа Ніны якраз такія ж боты, як у мяне.

— А вы іх у гардэробе не блытаеце?

— Іх нельга зблытаць.

— Чаму?

— Бо ў Ніны боты заўсёды чыстыя і прыгожыя, а ў мяне брудныя.

Усё правільна: лепш няхай будуць брудныя, але аднолькавыя, чым чыстыя і розныя.

☺ ☺ ☺

Прывёз дзяцей у школу. На ўваходзе стаіць завуч. Перад намі ідзе хлопчык, прыкладна клас пяты-шосты. Заходзіць у школу і кажа завучу:

— Добры дзень!

Завуч строга:

— Трэба было са мной у тралейбусе вітацца.

— Я вас не заўважыў у тралейбусе.

— Трэба заўважаць.

Мая парада пацану на будучыню: хадзіць у школу пешкі. А калі сядаеш у тралейбус, заходзячы гучна пытаць:

— Завуч дваццатай гімназіі ёсць?

— Ёсць.

— ДОБРЫ ДЗЕНЬ!

☺ ☺ ☺

Сын:

— Тата, можаш мне паставіць свой любімы гурт?

— Які?

— Ну, памятаеш, ты неяк мне ўжо ставіў: наш, беларускі. «Болцік-Вінцік» ці нешта падобнае.

Пакуль я гляджу на яго круглымі вачыма, жонка перакладала:

— Гэта ён, відаць, «Нейра Дзюбель» мае на ўвазе.

P. S. Сказаў яму, што, пакуль ён не вывучыць правільную назву гурта і не растлумачыць мне, што яна значыць, будзе слухаць выключна «Болцік-Вінцік».

☺ ☺ ☺

Размова двайнятак.

Вера:

— Напэўна, вельмі страшна працаваць сцюардэсай...

Поля:

— А што там страшнага? Два разы прайшоў па самалёце, а астатні час сядзіш прышпіленая.

Вера абурана:

— Поля, якая розніца, калі самалёт упадзе?!

Думаў, спрэчка скончана на карысць Веры, але дзе там.

Поля:

— Тады навошта, патвойму, у самалёце прышпільваюцца?

Вера не знайшла, што адказаць, і давялося ўжо мне растлумачыць, што падаць прыемней прышпіленым.

P. S. Хоць, вядома, я магу памыляцца.

☺ ☺ ☺

Сын:

— Тата, уяўляеш: у Майкла Джордана дом 17 тысяч квадратных метраў, у ім 15 ванных! Каштуе 29 мільёнаў долараў.

— Нядрэнна. А давай падлічым, колькі гэта ў маштабах Каменнай Горкі. Колькі ў нашым доме кватэр?

— Ну, можа, кватэр дзвесце.

— Кожная каштуе ў сярэднім тысяч 70. Значыць увесь наш дом каштуе...

— 14 мільёнаў.

— Значыць, дом Майкла Джордана каштуе прыкладна як два дамы ў Каменнай Горцы. Па-мойму, нічога асаблівага.

Сын неяк адразу страціў цікавасць да маёмасці Майкла Джордана, а я падумаў, што калі мераць багацце заходніх «зорак» дамамі ў Каменнай Горцы ці Шабанах, то ў нейкі момант пачынаеш іх нават шкадаваць.

☺ ☺ ☺

Кажу двайняткам:

— Ну што, у вас ужо любімыя ўрокі з'явіліся?

Поля:

— Так, у мяне фізкультура!

Вера:

— А ў мяне англійская мова!

Я:

— О, малайчына, Вера. А чым табе так падабаецца англійская?

— Проста на англійскай нам дазваляюць колькі хочаш разоў выходзіць у прыбіральню.

Як усё-ткі важна прывіваць любоў да замежных моў з самых ранніх гадоў...

☺ ☺ ☺

Старэйшая дачка:

— Тата, расказаць табе смешную гісторыю для тваёй кніжкі?

— Бясплатна ці за грошы?

— Лепш, вядома, за грошы.

— Тады не трэба.

— Я табе ўсё роўна раскажу, а ты сам вырашай.

Хітры маркетынгавы ход, разлічаны на наяўнасць у таты сумлення. На шчасце, гісторыя аказалася менш смешнай, чым міні-дыялог, які нарадзіўся ў выніку (да таго ж зусім бясплатны).

**Павел ХОЛАД.**

# ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ... У СМАРТФОНЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Таксама ў гульні змяшчаюцца галаваломкі...***

— Так, яна пабудавана такім чынам, што складаецца з больш чым сарака гісторый з Бібліі — ад стварэння свету, жыцця Ноя і Аўраама да Ісуса Хрыста і апосталаў. Усё расказваецца паслядоўна (ты слухаеш кавалак агучанага тэксту, глядзіш анімацыю), гартаеш далей, бачыш наступны фрагмент — такім чынам разглядаецца адна гісторыя. А напрыканцы ёсць заданні, звязаныя з прагледжаным матэрыялам — напрыклад, трэба ўзнавіць паслядоўнасць падзей (скласці ў патрэбным парадку адмысловыя карткі), суаднесці разам жывёл, прадметы, якія былі згаданыя.

***— Я чула, што нават дарослыя спрабавалі гуляць у гэтую гульню. Як думаеце, яна можа быць ім цікавая?***

— Думаю, што ў вялікай ступені яна будзе запатрабаваная і дарослымі — найперш з-за беларускай мовы. Бо гэта ўнікальны для нашай краіны прадукт. Ім ужо зацікавілася шмат людзей.

***— Наколькі простая беларускамоўная лексіка ўжываецца ў гульні, ці зразумелая яна сучасным дзецям?***

— Гэта тая ж мова, якая звычай выкарыстоўваецца ў дзіцячай мастацкай літаратуры — вершах і апавяданнях, што вывучаюць у школе. Іншае пытанне — узровень вывучэння беларускай мовы ў нас цяпер увогуле не самы лепшы. Але калі ёсць жаданне, то ўсё магчыма і зразумела.

***— Многія нашы чытачы ў тэлефонныя гульні ў прынцыпе ніколі не гулялі. Ці параіш ім увязвацца ў гэтую справу?***

— Я б параіў і не пачынаць (*усміхаецца*. — **Аўт.**), бо гэта забірае шмат часу, сілы. Аднак часта так адбываецца, што, незалежна ад таго, хочуць бацькі ці не, каб іх дзеці гулялі ў тэлефоне, яны ўсё адно бяруць яго ў рукі, знаходзяць там гульні і чымсьці занятыя. Таму, думаю, такая гульня будзе цудоўнай альтэрнатывай баўлення часу для дзяцей хоць бы малодшага ўзросту.

***— Раскажы аб персанажах гульні.***

— Гэта ўсе вядомыя біблейскія героі — Ісус, Аўраам, Ной, Майсей, Лот, Самсон, Пётр. Гэта даволі змястоўная гульня. Яна поўна перадае ўсё тое, што змяшчаецца ў Бібліі, толькі дзіцячай мовай. Можна сказаць, што гэта гульнявы аналаг дзіцячай папяровай кнігі.

***— Гукавое суправаджэнне рабіла каманда «Кінаконг», вядомая па працы над стужкамі, якія ідуць на вялікім экране. Раскажы крыху, як ствараласяа «агучка» для гульні.***

— У каманды няма сталага штата акцёраў, якія займаліся б агучваннем, таму для кожнага праекта ажыццяўляецца персанальны падбор кандыдатур. Агулам увесь працэс перакладу і агучвання расцягнуўся на паўгода. Асноўную частку арганізацыйнай працы зрабіла Надзея Кім. У выніку ўсё атрымалася надзвычай добра, гульню цалкам агучыў вядомы беларускі акцёр Павел Харланчук.

***— Ці спампоўвала сям'я Харланчукоў сабе гульню? Ці ёсць нейкія водгукі?***

— Мяркую, што яны карыстаюцца ёй. А вось нядаўна мы атрымалі водгук ад маладой маці Надзеі Гарэцкай, якая адзначае, што ім спадабалася выбраная гульнявая форма, схаваныя цікавосткі, якія ствараюць атмасферу адкрыцця, і карысныя пытанні на замацаванне. Яшчэ адна маладая мама Вераніка Шкараба кажа, што раней даводзілася карыстацца аналагічнай праграмай на ўкраінскай мове. А цяпер можна слухаць і чытаць па-беларуску. Яны асабліва адзначаюць: прыемна тое, што агучана ўсё добра знаёмым ім голасам Паўла Харланчука — «беларускага Пэтсана».

***— Ці ёсць выхаваўчы эфект у гэтай гульні?***

— У выхаванні дзяцей усё ж такі асноўную ролю адыгрываюць бацькі — не школа, не сябры, не вуліца, — і тое, што яны закладаюць, з'яўляецца падмуркам на ўсё жыццё. Таму, калі бацькі з дзецьмі пройдуць гэтую гульню, з'явіцца плён. Нават калі самі дзеці будуць гуляць у яе — немагчыма, каб гістарычныя факты не адклаліся ў свядомасці.

***— Чаму бацькам варта выхоўваць дзяцей менавіта з дапамогай Бібліі?***

— Таму што гэта тая кніга, у якой закладзены вечныя каштоўнасці. Могуць змяняцца сучасныя трэнды, але гэтыя запаветы ўжо некалькі тысячагоддзяў застаюцца нязменнымі і працуючымі: «паважай бацькоў», «не забівай», «не крадзі». Усё гэта фарміруе сапраўды здаровае грамадства. Незалежна ад таго, веруючыя бацькі ці не, важны падмурак, на якім далей будуецца жыццё, разуменне, як ставіцца да іншых людзей. Таму ў гульні закладзены моцны выхаваўчы і культурны аспект.

***— У чым заключаецца культурны аспект?***

— Ён базіруецца на тым, што гісторыя Беларусі мае глыбокія карані ў Бібліі. Летась мы святкавалі 500-годдзе кнігадрукавання. Каля Нацыянальнай бібліятэкі стаіць помнік Францыску Скарыну, які трымае Біблію. Цытата з гэтай кнігі змешчана і на фасадзе галоўнай бібліятэкі краіны. Гэта кніга была першай надрукаванай у нас, яна цытавалася ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага — галоўным законе



краіны. І многія нашы дзеячы былі так ці інакш звязаны з ёй: Ефрасіння Полацкая, Сымон Будны, Мікалай Радзівіл Чорны і іншыя. Таму гэта кніга сфарміравала нас як народ. Тая рэчаіснасць, у якой мы жывём, мае шматлікія адсылкі да яе. Хацелася б, каб гэта не гублялася і не зацёрлася ў сучасным імклівым свеце.

***— Наколькі важныя гэтыя маральныя падмуркі ў сучасным грамадстве?***

— XXI стагоддзе — гэта эпоха выклікаў, не толькі для Беларусі, але і для ўсяго свету. Гэта пытанні эміграцыі, штучнага інтэлекту, робататэхнікі, кроскультурнасці. Усё адбываецца імкліва, і, на жаль, некаторыя людзі і народы ў гэтым працэсе губляюць свае карані, гісторыю, — яны могуць застацца без глебы пад нагамі. Таму Беларусі, на маю думку, трэба базіравацца на чымсьці грунтоўным. Не спадзявацца на тое, што дзесьці пашанцуе, а працаваць, прытрымлівацца свайго гістарычнага шляху, культуры, і тады Беларусь будзе паспяховай краінай.

***— Часам можна назіраць такую карціну: бацькі хочуць, каб іх дзіця, акрамя рускай, ведала яшчэ англійскую ды іншыя мовы. Але беларускай у гэтым ланцужку не знаходзіцца месца...***

— Мяркую, што гэта з'яўляецца праблемай і віной не толькі бацькоў, але і больш глабальнай праблемай гістарычнага шляху Беларусі. Родная мова з'яўляецца важным чыннікам для нацыябудавання. Калі краіна страціць сваю мову, яна страціць і вялікую частку сваёй ідэнтычнасці, бо ў мове закладзены шматгадовы вопыт таго ці іншага народа, гэта можна прасачыць нават па тым, як будуецца пэўныя выразы, сказы (ёсць адмысловыя галіны навук, якія гэта вывучаюць). Напрыклад, можна параўнаць словы «свята» (ад «святы дзень») і «праздник» (ад «праздность»). Усё гэта моцна ўплывае на тое, як чалавек мысліць і ўспрымае гэты свет. Таму важна захаваць жывы ўжытак мовы. Здымаць фільмы, пісаць на ёй кнігі, навуковыя артыкулы, выкарыстоўваць у паўсядзённасці ды іншае.

***— Ці ёсць планы, як папулярызаваць гульню?***

— Думаю, важна, каб добрыя рэчы былі навідавоку. Многія людзі наракаюць, што яны не карыстаюцца беларускай мовай, бо на ёй няма таго, што ім патрэбна, — фільмаў, кніг, падручнікаў, у дадзеным выпадку — гульняў. І вось ёсць! Я б хацеў, каб людзі гэтым карысталіся, каб і яны, калі будуць стаяць перад нейкім выбарам, бачылі, што ёсць альтэрнатыва.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# У АДНУ РАКУ ТРОЙЧЫ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Калі нарадзіўся Альгерд, маладыя бацькі не маглі нарадавацца. На дварэ лета — не трэба было сядзець дома і баяцца выйсці на вуліцу з-за холаду, дажджу ці снегу. Праз год сын рабіў першыя крокі зноў жа па цёплых, залітых сонцам сцежках. Таму нараджэнне другога дзіцяці планавалі таксама на лета. Праўда, хто б мог падумаць, што супадзе не толькі месяц, але і дзень?

— На УГД урач паставіў дакладную дату — 19 чэрвеня. Але мы да апошняга хадзілі і ўсміхаліся. Ніхто не верыў, што такое магчыма. Схваткі пачаліся 18-га, і я ўжо нават настроілася, што паўтору не будзе. Аднак у Георгія былі іншыя планы. На свет ён выйшаў акурат 19-га! — кажа Кацярына. — Перажывала тады страшна. Усё думала, што падрастуць мае хлопцы і пачнуць запытвацца: «Як так, мама? У мяне няма свайго дня нараджэння». Затое, калі тэрміны нараджэння і трэцяга дзіцяці паставілі на чэрвень, усе ўспрынялі навіну спакойна. Нібыта так і трэба.

Яўген павінен быў з'явіцца 15-га, але, напэўна, вырашыў не парушаць традыцыю. Дарэчы, у нас не толькі дзеці ў гэты дзень нарадзіліся, але і родная сястра Ігара — Ала.

**«Я вельмі радая, што ў мяне тры хлопчыкі. Ужо разумею ўсю цяжкасць выхавання. Але думаю, Бог пакуль дзяўчынку не дае, таму што ў мяне характар прамалінейны».**

Цікаўлюся ў Лапікавых, як яны падбіралі імёны дзецям. Альгерд, Георгій, Яўген — надзвычай арганічна і сугучна.

— Гэта не мы. Дзеці самі вызначылі, як іх будуць зваць. Праўда, — заўважае Ігар.

— У нас ёсць фотаздымкі Альгерда з раддома. Ён там так ляжыць, нібыта ў сваіх маленькіх ручках кап'ё трымае. Ну выліты князь! — дадае Кацярына. — Імя Георгія мы падгледзелі ў царкоўным календары. Трэцяга сына думалі назваць Міронам. Але калі ён нарадзіўся, то адразу стала ясна: ніякі гэта не Мірон. Яўген — і кропка.

Нягледзячы на агульны дзень нараджэння, хлопчыкі вельмі розныя. Альгерд у дзіцячы садок пайшоў толькі ў пяць гадоў. Ён туды асабліва не рваўся, была магчымасць пакінуць яго дома — і Кацярына гэтым скарысталася. А Георгій, наадварот, як толькі яму споўнілася два, пабег у садок з задавальненнем. Які шлях абярэ Яўген, пакажа час.

## КАЦЯРЫНА-КРАСА І ЯЕ РЫЦАРЫ

Першае, на што звяртаеш увагу пры знаёмстве з Лапікавымі, — у бацькоў і траіх дзяцей русыя валасы і светлыя вочы. Міжволі ловіш сябе на думцы, што менавіта так павінны выглядаць сапраўдныя беларусы. Пры гэтым немагчыма адарваць позірк ад касы Кацярыны, бо яна, як у той народнай песні, дастае да самага пояса.



— Дзеці растуць, і каса расце, а муж пільнуе, — з усмешкай заўважае жанчына. — Я раней з даўжынёй эксперыментавала. Можа, і зараз адважылася б на перамены. Але Ігару падабаецца натуральная прыгажосць.

У размове са мной бацька сур'ёзны, нешматслоўны. Ажыўляецца, як толькі да яго падыходзяць дзеці. З зацікаўленасцю ловіць кожнае слова сыноў.

— Сёння смешна пра гэта казаць, але на першым спатканні я папрасіла Ігара... паказаць пашпарт! Мы пазнаёміліся на вуліцы, сацсеткі тады былі не вельмі папулярныя, а мне хацелася з самага пачатку зразумець, што за чалавек перада мной.

Ці то жартуючы, ці то ўсур'ёз Кацярына кажа, што лёс двойчы даў іх пары магчымасць праверыць пачуцці часам і адлегласцю:

— Калі мы пачалі сустракацца, я выйграла грант на навучанне ў магістратуры Маскоўскага філіяла Манчэстэрскага ўніверсітэта. Такі шанц выпадае раз у жыцці, таму дзеля адносін ад вучобы адмаўляцца не стала — паехала ў Расію. Ігара гэта зусім не спужала. Наадварот. Ён кінуў звыклае жыццё ў Мінску і паехаў услед за мной у чужы горад, дзе ў яго не было ні сяброў, ні працы. Такая рашучасць з яго боку даказала сур'ёзнасць намераў у дачыненні да мяне, — прызнаецца Кацярына. — На гэтым выпрабаванні не скончыліся. Бо пасля паўгода я правяла ў Лос-Анджэлесе ў сям'і роднай сястры Вольгі. Калі вярнулася з-за акіяна, Ігар ужо нікуды мяне не адпусціў. І правільна зрабіў, дарэчы. *(Смяецца.)*

***— Кажуць, што матулі, у якіх адны сыны, — асаблівыя.***

— Нешта ў гэтым ёсць. Я вельмі радая, што ў мяне тры хлопчыкі. Ужо разумею ўсю цяжкасць выхавання. Але думаю, Бог пакуль дзяўчынку не дае, таму што ў мяне характар прамалінейны. Хлопцам як скажаш, так яны і разумеюць. Дзяўчаткі, напэўна, патрабуюць большай далікатнасці, схільныя надумваць.

Адказнасць — вельмі важная якасць для мужчыны. У сваіх хлопцаў мы яе развіваем з маленства: вучым прасіць прабачэння. Правініўся і адчуваеш гэта — даводзь сітуацыю да лагічнага завяршэння. Здаецца, дробязь, але калі ўпусціш яе з самага пачатку, дарослага чалавека такому ўжо не навучыш.

***— Трымаеце сыноў у строгасці і дысцыпліне?***

— Хутчэй наадварот. Мы ім поўнасцю давяраем, таму даём поўную свабоду. Узялі малаток ці адвёртку — добра. Дапамагаюць дранікі смажыць ці цеста замешваць — добра. Мыюць падлогу — добра. Калі прыязджаем у Ружаны да сваякоў, то дзяцей не стрымаць: бягуць з бацькам на рыбалку, у лазню, нешта рамантуюць, распальваюць камін. І тут галоўнае не адбіць ахвоту. «Ты яшчэ маленькі, адыдзі» або «Не дарос» — такога ў нашым доме не чуваць. Празмернай асцярожнасці быць не павінна. Ёсць у беларусаў нават такая прыказка — «Дзіця, не ўпаўшы, не вырасце».

***— Не магу не запытацца пра ежу. Напэўна, гатуеце шмат?***

— Мне часта даводзіцца чуць: «Калі сыны падрастуць, будзеш дзень і ноч каля пліты стаяць і боршч вёдрамі варыць». У адказ на такія фразы ўсміхаюся. Бо гэтае пытанне я для сябе ўжо вырашыла: ніколі не гатую загадзя. Перш чым пайсці да пліты, запытваюся: што будзем есці? Разам выбіраем, разам гатуем, разам ямо. Тады і лішняга нічога не застаецца, і я дарма часу не трачу.




## ПРА КАРЭННЕ І НАСЕННЕ

Як толькі сыны пачалі гаварыць, у Лапікавых з'явілася цікавая традыцыя: на выхадных яны размаўляюць па-беларуску. Пакуль іншыя бацькі наракаюць на недахоп заняткаў на роднай мове ў школе ці садку, Ігар і Кацярына закладваюць беларускамоўны падмурак у сям'і. Увогуле, пара да культурнай спадчыны ставіцца з асаблівай павагай.

**«Дарэчы, у нас не толькі дзеці ў гэты дзень нарадзіліся, але і родная сястра Ігара — Ала».**

— З бязмежнай цеплынёй прыгадваю гады вучобы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Я захаплялася гістарычнай рэканструкцыяй і сама шыла-вышывала нацыянальныя строі. Разам з сяброўкай арганізоўвалі майстар-класы па бытавых танцах і фальклорных спевах, нават разам з гуртом «Стары Ольса» гастралявалі.

Захапленне народнай культурай у студэнцтве паўплывала і на выхаванне дзетак.

— Развіццё ў першы год жыцця — самае актыўнае і хуткае. Менавіта ў гэты час дзіця атрымлівае самыя моцныя ўражанні ад навакольнага свету. Не трэба думаць, што «яно нічога з гэтага не запомніць», і засяроджвацца толькі на мінімальных патрэбах — ежа, догляд, сон. Укладвацца трэба па максімуме і ў плане духоўнага развіцця: спявайце і расказвайце немаўлятку ўсё, што ведаеце самі.

Маленькі Альгерд перад сном заслухваўся беларускімі калыханкамі — ад усім вядомай «Доўгі дзень, цёплы дзень...» да рэдкіх фальклорных песень. Георгій чуў ад мамы і таты казкі на роднай мове. Яўген падчас кармлення слухае Моцарта.

— Калі яго пераадзяваю, пачынаю чытаць вершы. Усе, што ведаю на памяць: магу і «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага, і лірыку Аляксандра Блока. Упэўнена, гэта цудоўная база для далейшага развіцця хлопчыка.

***— А што з таго, што вам далі бацькі, вы хочаце перадаць сынам?***

— Трэба ўкладваць не толькі сродкі, але і сілы ў дзяцей. Вялізныя катэджы і шматлікія аўтамабілі шчасця не прынясуць. А любоў абавязкова вернецца. Гэтаму мяне навучыў бацька. Акрамя таго, у яго можна пераняць лёгкасць і свабоду думак, пастаянны палёт ідэй, якія на нас з сястрой аказалі моцны ўплыў. Ад маёй матулі хочацца перадаць дзеткам імкненне да прыгожага ва ўсім, — кажа Кацярына.

— А мяне вучылі так: дзе б ты ні апынуўся, як бы высока ні ўзняўся, не павінен забывацца на свае карані, — разважае Ігар. — Наша сямейная геаграфія — гэта Брэстчына, Гомельшчына, Магілёўшчына. Хачу, каб сыны памяталі не толькі адкуль выйшлі, але і ўсіх, хто быў у родзе да іх. Бо, як паказвае практыка, з тымі, хто адбіўся ад сваіх, нічога добрага не бывае.

**Ганна КУРАК.**
**Фота аўтара і з сямейнага архіва.**

zepter bank

## Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

### Бухгалтерский баланс на 1 октября 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2018 | 01.01.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3 596 | 4 724 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 4 060 | 1 771 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 2 574 | 12 075 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 6 043 | 11 062 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 70 943 | 45 576 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 8 845 | 12 346 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 3 889 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 8 359 | 7 173 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 2 916 | 3 689 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 111 225 | 98 416 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 5 103 | 7 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 62 388 | 56 753 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 3 563 | 1 713 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 1 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 485 | 675 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 71 539 | 59 149 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 15 859 | 15 859 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1 493 | 1 482 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 5 723 | 5 732 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 16 611 | 16 194 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 39 686 | 39 267 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 111 225 | 98 416 |

### Отчет о прибылях и убытках на 1 октября 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2018 | 01.10.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 4 760 | 5 953 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 091 | 2 309 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 669 | 3 644 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 056 | 1 097 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 176 | 165 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 880 | 932 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 31 | (14) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 371 | 525 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4 | (27) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (1 081) | 73 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 022 | 1 345 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5 418 | 5 944 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 152 | 128 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 488 | 260 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 69 | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 419 | 260 |

Председатель Правления Проворов Михаил Игоревич

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания: 1 октября 2018 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 31, выданная Национальным банком Республики Беларусь 28 мая 2013 г.
УНП 807000214

---

В связи с реорганизацией РУП «Стройтехнорм» путем присоединения к нему государственного учреждения образования «Белучцентрстром» (приказ Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 10.08.2018 № 174 «О реорганизации РУП «Стройтехнорм» путем присоединения к нему государственного учреждения образования «Белучцентрстром») первичная профсоюзная организация государственного учреждения образования «Белучцентрстром» прекращает свою деятельность.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу:

220014, г. Минск, ул. К. Минина, 9, телефон 226-29-88.

УНП 102384753

---

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом). Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

**Цех деревообработки с административными помещениями** (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьев. водопровода 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации; очистные сооружения; двухкамер. септик; поля фильтрации 235 м; покрытия 6446 кв. м.
**Склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м.), в т. ч. пристройка.
**КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м.
**ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м).
**Водозаборная скважина** 615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos.
**Насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м; сети пожар. водопровода 484,3 м.
**Иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно–быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения – находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 7 коп.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60 % от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 29.08.2018**

**Аукцион состоится 16.11.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 14.11.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280 36-37; 8029-317-95-42. **www.cpo.by**

---

